Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава"

**Я. Н. Марозава**

# АЛІМПІЯДНЫЯ ЗАДАННІ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

*Вучэбна-метадычныя матэрыялы для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей*

Віцебск
2012

# УВОДЗІНЫ

Выкладанне дысцыпліны спецыялізацыі "Алімпіядныя заданні па беларускай мове" мае на мэце актывізаваць, сістэматызаваць і паглыбіць веды студэнтаў па найбольш складаных тэмах фанетыкі і арфаэпіі, графікі і арфаграфіі, лексікі і фразеалогіі, марфемікі і словаўтварэння, марфалогіі і сінтаксісу. Курс арыентаваны на выкананне прапанаваных выкладчыкам і складанне ўласных ***лінгвістычных заданняў.***

Пры выкладанні курса прымаецца пад увагу фактар беларуска-рускага двухмоўя ў краіне, таму пры падборы вучэбнага матэрыялу асноўная ўвага засяроджваецца на адметнасцях нацыянальнай мовы ў галіне лексікі, фразеалогіі, арфаэпіі і граматыкі. Прапанаваныя разнастайныя алімпіядныя заданні стымулююць пазнавальную дзейнасць студэнтаў, паглыбляюць іх лінгвістычную эрудыцыю, павышаюць культуру вуснага і пісьмовага маўлення, пабуджаюць звяртацца да слоўнікаў, лінгвістычных даведнікаў.

**МЭТА** выкладання дысцыпліны – азнаёміць студэнтаў з правіламі і прыёмамі правядзення алімпіяды па беларускай мове як навукова-педагагічнага мерапрыемства; паглыбіць тэарэтычную і практычную падрыхтоўку студэнтаў па беларускай мове праз рашэнне разнастайных алімпіядных заданняў; выпрацаваць у студэнтаў навыкі складання алімпіядных заданняў у рамках лінгвістычнага конкурсу.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

1. Сістэматызацыя, паглыбленне ведаў студэнтаў па асноўных раздзелах сучаснай беларускай мовы.

2. Актывізацыя лінгвістычнага мыслення студэнтаў, развіццё іх інтэлектуальных і творчых здольнасцей.

3. Выпрацоўка навуковага погляду на факты мовы, навыкаў творчага асэнсавання моўнай з'явы і пошуку неадназначных адказаў на нестандартныя заданні.

4. Замацаванне ў студэнтаў уменняў прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы, дасканала валодаць нормамі сучаснай беларускай мовы.

5. Забеспячэнне бесперапыннай філалагічнай адукацыі выпускніка факультэта.

На вывучэнне курса "Алімпіядныя заданні па беларускай мове" адводзіцца ў 6-м семестры ФБФіК **20 лекцыйных** і **14 практычных гадзін**, размеркаваных па тэмах наступным чынам:

| № п/п | | ТЭМА | Колькасць гадзін |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 2 | 3 |
| **ЛЕКЦЫІ:** | | | |
| 1. | Уводзіны. Змест, структура, задачы дысцыпліны. Літаратура. Крытэрыі ацэнкі заданняў. | | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| 2. | ЛЕКСІКА І ФРАЗЕАЛОГІЯ. Праца са слоўнікамі сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў, з фразеалагічнымі слоўнікамі. | 4 |
| 3. | ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ. АКЦЭНТУАЦЫЯ. | 2 |
| 4. | МАРФЕМІКА І СЛОВАЎТВАРЭННЕ. Афіксальныя спосабы словаўтварэння. Спосабы складання. | 4 |
| 5. | МАРФАЛОГІЯ. Назоўнік. Катэгорыі роду, ліку. Склонавыя канчаткі назоўнікаў. Прыметнік, яго разрады, ступені параўнання, функцыя ў сказе. Лічэбнік, яго разрады, скланенне, сінтаксічная сувязь з назоўнікамі, роля ў сказе. Займеннік, яго разрады, ужыванне. Дзеяслоў, дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе. | 4 |
| 6. | СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ. Словазлучэнне. Віды аднасастаўных сказаў. Няпоўныя, эліптычныя сказы. Размежаванне знешне падобных аманімічных канструкцый. | 4 |
| | **УСЯГО ЛЕКЦЫЙНЫХ** | **20 гадз.** |

| | | |
|---|---|---|
| | **ПРАКТЫЧНЫЯ:** | |
| 1. | Лексіка. Фразеалогія. Фанетыка. Арфаэпія. | 2 |
| 2. | Марфеміка. Словаўтварэнне. | 2 |
| 3. | Марфалогія. Назоўнік. Прыметнік. Лічэбнік. Займеннік. | 2 |
| 4. | Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе. | 2 |
| 5. | Прыслоўе і БПС. Няпоўназнамянальныя часціны мовы. | 2 |
| 6. | Сінтаксіс і пунктуацыя. Словазлучэнне. Простыя і складаныя сказы. | 2 |
| 7. | Паўтарэнне ўсіх тэм. Комплекснае заданне да заліку. | 2 |
| | **УСЯГО ПРАКТЫЧНЫХ** | **14 гадз.** |

# Л І Т А Р А Т У Р А


| № п / п | Пералік літаратуры | Год выдання |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 1. | Абабурка М.В. Культура беларускай мовы. | Мн., 1994 |
| 2. | Анічэнка У.В. Беларуская мова: Дапам. для самаадукацыі. | Мн., 1998 |
| 3. | Беларуская мова. Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. | Мн., 1994 |
| 4. | Грабчыкаў С.М. Цяжкія выпадкі ўжывання блізкіх па гучанні слоў. | Мн., 1997 |
| 5. | Камароўскі Я.М. Сучасная беларуская арфаграфія. | Мн., 1985 |
| 6. | Каўрус А.А. Стылістыка беларускай мовы. | Мн., 1990 |
| 7. | Красней В.П. Грані слова. Выд. 3-е | Мн., 1996 |
| 8. | Коваль У.І. Чым адгукнецца слова: Фразеалогія ў павер'ях, абрадах і звычаях. | Мн., 1994 |
| **9.** | Куліковіч У.І. Школьныя алімпіяды па беларускай мове. | Мн., 2006 |
| **10.** | Куліковіч У.І. Матэрыялы раённых алімпіяд па беларускай мове (2003 - 2005 гг.). | Мн., 2006 |
| 11. | Лепешаў І.Я. Асновы культуры мовы і стылістыкі. | Мн., 1987 |
| 12. | Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні. | Гродна, 2002 |
| **13.** | Малажай Г.М., Красней В.П. Алімпіяды па беларускай мове. Дапам. для навучэнцаў агульнаадукац. школ, гімназій, ліцэяў.— 2-е выд. | Мн., 2001 |
| 14. | Малажай Г.М., Рачэўскі С.Р. Пазакласная праца па беларускай мове. | Мн., 1990 |
| 15. | Малажай Г.М. Сучасная беларуская мова: Слова. Перыфраза. Фразеалагізм. | Мн., 1992 |
| 16. | Паўлоўская В.І. Мова: Цікава і займальна. | Мн., 1989 |
| 17. | Прыгодзіч М.Р. Шчодрасць слова. | Мн., 1990 |
| 18. | Рагаўцоў В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні. | Мн., 2001 |
| 19. | Старычонак В. Займальная філалогія. | Мн., 1998 |
| 20. | Сцяцко П.У. Праблемы нормы, культуры мовы. | Гродна, 1998 |
| 21. | Сцяцко П.У. Культура мовы. | Мн., 2002 |
| 22. | Цікоцкі М.Е. Сугучнасць слоў жывых… | Мн., 1981 |

| | | |
|---|---|---|
| 23. | Юрэвіч У. Слова жывое, роднае, гаваркое... / Дапам. для настаўнікаў. | Мн., 1998 |
| 24. | Янкоўскі Ф.М. Само слова гаворыць. | Мн., 1984 |
| | **СЛОЎНІКІ. ДАВЕДНІКІ** | |
| **1.** | Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Кіраванне ў беларускай і рускай мовах: Слоўнік-даведнік. | Мн., 1991 |
| **2.** | Бардовіч А.М., Шакун Л.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы.— 2-е выд. | Мн., 1989 |
| **3.** | Бардовіч А.М., Круталевіч М.М., Лукашанец А.А. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы. | Мн., 2000 |
| 4. | Беларуская мова: Энцыклапедыя. | Мн., 1994 |
| 5. | Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. | Мн., 1996-2004 |
| 6. | Гаўрош Н.В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. | Мн., 1998 |
| 7. | Грабчыкаў С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы. | Мн., 1994 |
| 8. | Клышка М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў.— 2-е выд. | Мн., 1993 |
| 9. | Лазоўскі У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы. | Мн., 1992 |
| 10. | Лепешаў І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2-х т. | Мн., 1993 |
| 11. | Старычонак В.Дз. Слоўнік амонімаў беларускай мовы. | Мн., 1991 |
| 12. | Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне. | Мн., 1987 |

# ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## Раздзел 1. ЛЕКСІКА

**Пытанні**. Асноўныя правілы словаўжывання. Прамое і пераноснае значэнні слова. Метафара ў кантэксце мастацкага твора. Мнагазначныя словы, амонімы, сінонімы, антонімы, паронімы, іх роля ў мове і ўжыванне ў мастацкім тэксце. Праца са слоўнікамі сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў.

**Заданне 1**. Запішыце сказы, у якіх дзеясловы ***вывесці*** з'яўляліся б кантэкстуальнымі антонімамі. Патлумачце. *Максімальная колькасць балаў — **3** (**2** балы за сказы + **1** бал за тлумачэнне).*

**Заданне 2.** Запоўніце табліцу. *Максімальная колькасць балаў* — **4 (0,5** *бала за кожнае слова***)**.

| Звязаны кампанент грэчаскага паходжання | Паняцце, якому адпавядае гэты кампанент | Слова-тэрмін з гэтым кампанентам |
|---|---|---|
| *Нана-* | 'карлікавы' | *нана*тэхналогіі |
| *Акра-* | 'крайні', 'самы высокі' | |
| *Гідра-* | | |
| *Піра-* | | |
| *Антрапа-* | | *антрапа*сфера |
| *Гелія-* | | |

**Заданне 3.** Адным са шляхоў беларускай тэрмінатворчасці з'яўляецца калькаванне пераважна з рускай мовы. Пры гэтым адбываецца імітацыя іншамоўнай мадэлі сродкамі нашай нацыянальнай мовы: *картофелехранилище — бульбасховішча*. Запішыце беларускамоўныя адпаведнікі да наступных рускамоўных тэрмінаў. *Максімальная колькасць балаў* — **3 ( 0,5** *бала за кожнае слова***)**.

1. Воздуховод —
2. Оврагообразование —
3. Пылеуловитель —
4. Клеверомолотилка —
5. Волноустойчивость —
6. Бензокраситель —

**<u>Заданне 4</u>.** Назіранні над мовай сучаснай газеты паказваюць, што вельмі часта няведанне дакладнага лексічнага значэння слова прыводзіць да **<u>маўленчага лішку</u>**. 1) Выпішыце са сказаў у табліцу (калі ёсць) лішняе(ія) слова(ы), патлумачце. 2) Запішыце, якім тэрмінам мовазнаўцы называюць гэту з'яву. *Максімальная колькасць балаў* — **7** (**1** *бал за прыведзены тэрмін* + **6** *балаў* — **1** *бал за кожны сказ*).

1. У такі святочны дзень на сцэну выносяць сцягі, уручаюць памятныя сувеніры.

2. На Усебеларускім з'ездзе ад Мінскай вобласці будуць прысутнічаць 95 чалавек дэлегатаў.

3. Жыхары новага аграгарадка з радасцю расказалі пра перспектывы на будучыню.

4. Нашы поспехі ў сельскай гаспадарцы — вынік паляпшэння агратэхнікі.

5. Студэнтам трэцяга курса С. Міхайлаву і В. Пятрову была аб'яўлена вымова за прагул заняткаў без уважлівых прычын.

6. Аляксея аднакурснікі называлі аніматэр кампаніі.

**<u>АДКАЗ</u>:**

| **Лішняе(ія) слова(ы)** | ***Тлумачэнне*** |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| 5. | |
| 6. | |

**<u>Заданне 5</u>.** Вядомы мовазнаўца Алесь Каўрус сцвярджае, што ў вуснай і пісьмовай мове нярэдкія выпадкі празмернасці выражэння (**<u>таўталогія, плеаназм</u>**). Падкрэсліце ў прапанаваных сказах неабавязковыя, лішнія словы. *Максімальная колькасць балаў* — **3.**

**1.** Хлопцы выйшлі на ўзлесак і ад яго праставалі напрамкі праз вузкую лапіну поля. **2.** На старой ліпе з усіх сіл шчыравалі буслы. **3.** Старанная праца кіпіць на заводзе. **4.** Выдавецтва планавала сваю работу і выпускала падручнікі і вучэбныя дапаможнікі выключна толькі на рускай мове. **5.** Марыля шчаслівымі ад радасці вачыма глядзела на сваіх дзетак. **6.** Дзядзька Антось безвынікова стукаўся ў дзверы розных службовых інстанцый і не мог ніяк адчыніць іх.

**<u>Заданне 6</u>.** Утварыце і запішыце новыя словы з адпаведным значэннем, якое прыводзіцца ў дужках. *Максімальная колькасць балаў* — **3.**

Канферансье → …………………………………(выконваць абавязкі канферансье).

Ткач → ……………………………… (дачка ткача).

Цукар → ……………………………… (прадпрыемства па вытворчасці цукру).

Ячмень → ………………………………(поле, з якога сабралі ячмень).

Сала → ………………………………… (прадпрыемства, дзе вытопліваюць сала).

Гук → …………………………… (спалучэнне некалькіх гукаў рознай вышыні).

**<u>Заданне 7.</u>** Многія беларускія даследчыкі неаднаразова адзначалі, што за гады савецкай улады ў склад беларускай літаратурнай мовы замест добра матываваных адзінак з жывой народнай мовы без патрэбы было ўключана безліч слоў іншамоўнага паходжання. Гэта прывяло да страты ў нашай мове шматлікіх найменняў і <u>самабытнай беларускай тэрміналогіі</u>. У пустыя клеткі запішыце <u>запазычаныя словы</u>, якія ”прыжыліся” ў нашай мове замест лексем, што былі зафіксаваны ў слоўніках 20-х гг. XX ст. *Максімальная колькасць балаў* — **4.**

| ”Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік” В. Ластоўскага (1924 г.) | ”Расійска-беларускі слоўнік” С. Некрашэвіча і М. Байкова (1928 г.) | ”Руска-беларускі слоўнік” пад рэд. К.Крапівы (1982 г.) |
|---|---|---|
| адступнік, здраднік | адшчапенец, пярэкрут | |
| прымус, прыгнечаньне | уціск | |
| спачынак | адпачынак | |
| мнагабожнасьць | мнагабожжа | |
| раўналежны | супастаўны | |
| падменьнік | падменьнік | |
| здарэньне | прыгода, выпадак | |
| усясьвет | сусьвет | |

**<u>Заданне 8.</u>** Дадзены азначэнні жанраў канцылярска-справавога падстылю. На месцы пропуску запішыце назвы гэтых жанраў. *Максімальная колькасць балаў* - **5.**

**1.** Дакумент, складзены некалькімі асобамі, які пацвярджае ўстаноўленыя факты і падзеі —

**2.** Дакумент, які змяшчае просьбу або прапанову асобы ўстанове або кіраўніку, напрыклад, аб прыёме на працу, прадастаўленні адпачынку і т. д. —

**3.** Прававы акт, падпісаны кіраўніком арганізацыі з мэтай вырашэння асноўных і аператыўных задач, якія стаяць перад <u>дадзеным</u> органам *(Грамацеі. Кім дадзеным? Хто яго каму даў? Беларусаведы!??)* —

**4.** Пералік якіх-небудзь <u>дадзеных</u>, размешчаных у пэўным парадку —

**5.** Дакумент, які фіксуе пагадненне двух ці некалькіх бакоў —

**6.** Дакумент, адрасаваны кіраўніцтву, у якім асвятляецца якое-небудзь пытанне з вывадамі і прапановамі складальніка —

**7.** Дакумент з указаннем належнай сумы грошай за адпушчаны тавар ці выкананую работу —

**8.** Дакумент, якім давяраецца каму-небудзь дзейнічаць ад імя таго, хто выдаў гэты дакумент —

**9.** Дакумент, які вызначае склад работнікаў якой-небудзь установы, прадпрыемства з указаннем іх пасад і акладаў —

**10.** Дакумент аб выкарыстанні выдаткаваных сродкаў —

**Заданне 9.** Запішыце па 4 вядомыя вам беларускія варыянты (размоўныя, гутарковыя) наступных мужчынскіх імён. *Максімальная колькасць балаў* — **5** *(* **0,25** *бала за кожнае адпаведане слова).* Гл. узор на першым імені.

| | |
|---|---|
| Іван | *Ясь, Янка, Яну́к, Іва́сь, Ваня.* |
| Іосіф | |
| Дзмітрый | |
| Павел | |
| Фядосій | |
| Фёдар | |

**Заданне 10.** Запішыце па-беларуску. *Максімальная колькасць балаў* — **3** *(***0,5** *бала за правільны адпаведнік).*

1. Исследование процесса речи —
2. Пламенная речь —
3. Завёл речь о —
4. У парня непонятная речь —
5. Об этом не было и речи —
6. Прямая (косвенная) речь —

**Заданне 11.** Замест устарэлых прыслоўяў запішыце сучасныя адпаведнікі. *Максімальная колькасць балаў* — **2.**

| | |
|---|---|
| Впятеронасобъ — | Выдвое — |
| Гдекольвекъ — | Втроенасобъ — |

**Заданне 12.** Патлумачце, на падставе чаго ***праснак*** называюць ***скавароднікам,*** а ***дранікі — таркаванцамі*** ? *Максімальная колькасць балаў* – **2.**

**Заданне 13.** Кожнай мове, як вядома, уласціва сваё, толькі для яе характэрнае адлюстраванне свету. Адна з праяў такой ідыяматыкі паміж рускай і беларускай мовамі заключаецца ў тым, што некаторыя з'явы руская мова абазначае апісальна, спалучэннем слоў, а беларуская — адной лексемай: ***железная дорога — чыгунка.*** Падбярыце і запішыце беларускія адпаведнікі да рускамоўных апісальных выразаў.

*Максімальная колькасць балаў* — **5** *(* **0,5** *бала за адно слова).*

| Апісальны выраз у рускай мове | Беларускамоўны адпаведнік |
|---|---|
| предвечернее время — | |
| булыжная мостовая — | |
| падающая звезда — | |
| парное молоко — | |
| оладьи из тёртого картофеля — | |
| моховое болото — | |
| заливной луг — | |
| луна в последней четверти — | |
| лягушачья икра — | |
| дерзко отважный человек — | |
| завершение уборки картофеля — | |
| ветряная мельница — | |
| летучая мышь — | |
| книжный магазин — | |
| пивная кружка — | |
| возвышенный участок леса в бору; молодой сосновый лес — | |
| крепостное право — | |
| с обеих сторон, по обе стороны чего-либо — | |
| отцовское наследство — | |
| заготовка сена — | |
| впасть в детство, вести себя подобно ребёнку — | |
| анютины глазки — | |
| тёплые страны, куда летят зимовать пералётные птицы — | |
| место, где стоял или стоит замок — | |

**Заданне 14.** Успомніце і запішыце беларускія словы і словазлучэнні, эквівалентныя наступным запазычанням. *Максімум балаў* — **4** ( **0,5** *б. за* **1** *слова*).

| |
|---|
| 1. Адэкватны — |
| 2. Індыферэнтны — |
| 3. Маніторынг — |
| 4. Індыкатыў — |
| 5. Экспансія — |
| 6. Кампетэнцыя — |
| 7. Электарат — |
| 8. Элегантны — |

**Заданне 15.** Як вядома, беларуская нацыянальная мова ў адрозненне ад рускай не мела прамых сувязей са старажытнай пісьмовай традыцыяй. Пра гэта сведчыць як фанетычная сістэма нашай мовы, так і лексічны склад, дзе фактычна адсутнічаюць кампаненты старaславянскага паходжання. Прыгадайце і запішыце сінонімы, якія выкарыстоўваюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове замест рускіх складаных слоў з першым кампанентам, старaславянскім па паходжанні. *Максімальны бал* — **4** ( **0,5** *бала за беларускі адпаведнік ці адпаведнікі да аднаго рускага слова*).

1) боготворить —
2) благодетельный (*устар.*) —
3) благоволение (*устар.*) —

4) благоухание —
5) благочиние (*устар.*) —
6) злосчастие —
7) злопыхательский —
8) времяпрепровождение —

**Заданне 16**. Дапамажыце Алесю падлічыць гасцей, якія прыйдуць віншаваць яго бацьку з юбілеем. Пастаўце неабходныя знакі прыпынку. Дайце кароткае абгрунтаванне... *Максімальная колькасць балаў* — **5** (**1** — *за колькасць,* **2** — *за пунктуацыю,* **2** — *за абгрунтаванне*).

*Сынок, запішы, калі ласка, хто сёння прыйдзе на татаў юбілей: дапаможаш мне накрыць на стол. Запісвай, Алеська, уважліва!*

*Канечне, будуць дзядуля з бабуляй татавы бацькі свёкар са свякроўю завітае дзядзька Вінцэсь бацькаў брат мой дзевер мой брат і твой дзядзька Павел бацькаў швегер яго жонка Гэля мая нявестка твой стрыечны брат Юрась бацькаў пляменнік мая ятроўка Настасся... Хто ж далей? Так, цётка Аўдоцця бацькава сястра мая залоўка і мае бацькі твае дзядуля Пілiп і бабуля Хрысціна бацькавы цесць з цешчай... Здаецца, Усе. А зараз накрываем на стол!*

**Заданне 17.** Пісьмова адкажыце на пытанне:

Словы ***груша, сліва, яблык, персік, абрыкос, вішня*** ўтвараюць тэматычную групу. Але адно слова ўсё ж такі выпадае з агульнага рада. Якое гэта слова (**0,5** *бала*) і чаму яго можна лічыць **лішнім** (**0,5** *бала*) ? (Пад увагу бярэцца толькі лексічны аспект).

**Заданне 18.** Амонімамі **(1)** ці мнагазначнымі словамі **(2)** з'яўляюцца прыведзеныя пары слоў. Пастаўце адпаведную лічбу. *Максімальная колькасць балаў — **3** ( 0,5 бала за кожную пару).*

| Пары слоў | Ліч-ба | Пары слоў | Ліч-ба |
|---|---|---|---|
| 1. ***Бялок*** 'празрыстая частка птушынага яйка' і ***бялок*** 'непразрыстая абалонка вока' | | 4. ***Лябёдка*** 'самка лебедзя' і ***лябёдка*** 'машына для падымання і перамяшчэння грузу' | |
| 2. ***Парк*** 'пасаджаны гай з алеямі, кветнікамі' і ***парк*** 'сукупнасць транспартных сродкаў, рухомы састаў' | | 5. ***Проза*** 'невершаваная літаратура, у адрозненне ад паэзіі', і ***проза*** 'будзённасць, паўсядзённасць жыцця' | |
| 3. ***Разрыў*** 'месца, дзе што-н. разарвана; прамежак, які ўтварыўся паміж разарванымі часткамі чаго-н.; прамежак у часе' і ***разрыў*** 'поўнае спыненне якіх-н. адносін паміж кім-н.' | | 6. ***Вывесці*** 'выключыць, прымусіць выбыць' (вывесці з гульні) і ***вывесці*** 'зрабіць вывад, прыйсці да чаго-н. разважаннем' (вывесці формулу) | |

**Заданне 19.** Васіль Вітка ў вершы "Беларуская мова" згадвае два выпадкі таго, як вядомы партыйны дзеяч часоў Сталіна **Цанава** настойваў на тым, каб у пэўных беларускамоўных тэкстах не ўжываліся два беларускія словы. "*Да іх бязлітасна быў строгі міністр дзяржаўнай засцярогі. Дзе толькі сустракаў іх кат, зусюль выпорваў...*" — піша Васіль Вітка. Запішыце 1) гэтыя два словы; 2) прыкладныя кантэксты, з якіх яны былі выкінуты або заменены; 3) лексічную моўную з'яву, якая стала прычынай непаразумення. *Максімальная колькасць балаў — **3** ( **1** бал за кожны пункт).*

**Заданне 20.** Растлумачце значэнне слоў пры дапамозе сінонімаў. З кожным словам складзіце словазлучэнні.

1) асмужаны —
   асмяглы —
2) асобы —
   асобны —
3) асаблівы —
   асабісты —
4) натуральны —
   натурлівы —
5) несумленны —
   несумненны —

6) даверaны —
   даверлівы —
7) грамадскі —
   грамадзянскі —

**Заданне 21.** Перакладзіце выразы аднаслоўнымі беларускімі адпаведнікамі.

| Апісальны выраз у рускай мове | Беларускамоўны адпаведнік |
|---|---|
| напиток из берёзового сока | |
| пребывание в гостях | |
| лишить свободы | |
| детёныш лося | |
| стать на колени | |
| католический монастырь | |
| дом лесника и его семьи | |
| в этом году | |
| жестяная банка | |
| потерять сознание | |
| звонить по телефону | |
| способный на тяжёлую работу | |
| выносливый в труде | |

**Заданне 22.** Растлумачце лексічнае значэнне наступных слоў. Якім агульным лінгвістычным тэрмінам іх можна назваць?

1) бацькоўскі —
   бацькаўскі —
2) ружавець —
   ружовіць —
3) зварот —
   зваротак —
4) звязаны —
   звязны —
5) горны —
   гарысты —
6) драпежны —
   драпежніцкі —
7) чытач —
   чытальнік —

**Заданне 23.** Запішыце як мага больш складаных слоў, якія абазначаюць сельскагаспадарчыя машыны.

**Заданне 24.** Падбярыце рускія адпаведнікі да наступных слоў. *4 балы.*

Бурштын — жыхар — верас —

азіміна — чашчавік — набрынялы —

выдма — ядловец —

**Заданне 25.** Як вядома, антанімічная апазіцыя можа быць самай рознай (часавай, прасторавай і інш.). Запоўніце табліцу. (*Максімальная колькасць балаў* — *4; 0,5 бала за кожную запоўненую клетку*)

| Слова | Антонім | Тып антанімічнай апазіцыі |
|---|---|---|
| учора | заўтра | часавая |
| цэнтр | перыферыя | |
| гучны | | |
| | нізасць (подласць) | маральная |
| шчодрасць | | |
| | чырвоны (пра святлафор) | сімвалічная |
| пляскаць | свістаць | |
| | поўнач | прасторавая |

# Раздзел 2. ФРАЗЕАЛОГІЯ

**Пытанні.** Фразеалагізм і слова, фразеалагізм і словазлучэнне. Семантычныя і стылістычныя адценні фразеалагізмаў. Праца з фразеалагічнымі слоўнікамі.

**Заданне 1**. Суаднясіце сінанімічныя фразеалагізмы. *Максімальная колькасць балаў* — ***2,5.***

| | |
|---|---|
| 1 – вудзіць акунёў | А – пець рэпку |
| 2 – выплакаць вочы | Б – вырываць з коранем |
| 3 – грушы на вярбе | В – табаку важыць |
| 4 – зраўняць з зямлёй | Г – трапляць у нерат |
| 5 – заходзіць у тупік | Д – трызненне сівой кабылы |

**1.___ , 2.____ , 3.____ , 4.____ , 5.____.**

**Заданне 2**. Запоўніце табліцу. *Максімальная колькасць балаў* — **5** (**0,5** *бала за кожную клетку*).

| Уласцівасці чалавека і якасці яго характару | Фразеалагізм | Што абазначае фразеалагізм |
|---|---|---|

| | | |
|---|---|---|
| | Ад шчырага сэрца (душы) | |
| | Сцяўшы зубы | |
| Розум. Кемлівасць | | |
| Бесклапотнасць | | |
| | Не пакладаючы рук; закасаўшы рукавы | |

**Заданне 3**. Запішыце фразеалагізмы, семантычна суадносныя з наступнымі словамі. *Максімальны бал — **4** (**0,5** бала за фразеалагізм)*.

| **Словы** | **Фразеалагізмы** |
|---|---|
| 1. Забыцца | |
| 2. Насміхацца | |
| 3. Заблытаць | |
| 4. Перабольшваць | |
| 5. Бессаромна | |
| 6. Недарэчнасць | |
| 7. Нечакана | |
| 8. Моцна (спаць) | |

**Заданне 4**. У кожным слупку знайдзіце лішні фразеалагізм. Растлумачце, чаму ён лішні, складзіце з ім сказ.

| | |
|---|---|
| **1.** *За вушы не адцягнеш;*<br>*пальчыкі абліжаш;*<br>*расце ў роце;*<br>*у роце растае* | **2.** *Курам на смех;*<br>*не лезе ні ў якія вароты;*<br>*нікуды не варты;*<br>*як курыца лапай* |
| **3.** *Даць жару;*<br>*даваць стракача;*<br>*здымаць стружку;*<br>*намыліць шыю* | **4.** *Адным скокам;*<br>*на адной назе;*<br>*на шырокую нагу;*<br>*як на пажар* |

**Заданне 5**. Ахарактарызуйце фразеалагізмамі чалавека

а) спакойнага, шчырага, рахманага —

б) гаваркога, вострага на язык —

в) абыякавага, безадказнага, ненадзейнага —

г) адказнага да справы, уважлівага да людзей —

**Заданне 6.** Растлумачце фразеалагізмы:

***адрэзаная луста*** —
***даць дыхту*** —
***для блізіру*** —
***мець зуб*** —
***несці свой крыж*** —
***гады ў рады*** —
***мазоліць вочы*** —
***насіць на руках*** —
***нос задзіраць*** —
***у свіныя галасы*** —

**Заданне 7.** **Падкрэсліце** фразеалагізмы, аб'яднаныя значэннем 'прыслугоўваць, дагаджаць, ліслівіць'. Хто з беларускіх мовазнаўцаў вывучаў (вывучае) устойлівыя адзінкі мовы?

*Біць у званы, у пер'е ўбрацца, лістам слацца, ісці рукой, хадзіць на задніх лапках, віляць хвастом, акунёў вудзіць, падпусціць лёстачак, вады не замуціць, пець лазара, свяціць вачыма, строіць кепікі, насіць на руках.*

**Заданне 8.** Растлумачце значэнне фразеалагізмаў:

*з ласкі на пацеху* —

*падрэзаць крылы* —

*не спаць у шапку* —

*пазбіваць рогі* —

*на злом галавы* —

**Заданне 9.** Вызначце, з маўлення прадстаўнікоў якіх прафесій паходзяць наступныя фразеалагізмы. Укажыце значэнне гэтых фразеалагізмаў. Адказ афарміце ў выглядзе табліцы. (*Максімальная колькасць балаў — **5**. За любую дапушчаную памылку здымаецца **0,5** бала*).

| Паходжанне ФА | Фразеалагізм | Значэнне фразеалагізма |
| --- | --- | --- |
| | *напасці на след* | |
| | *нізкай пробы* | |
| | *ні сучка, ні задорынкі* | |
| | *пад заслону* | |
| | *скідаць ( скінуць) з рахунку* | |

**Заданне 10.** Дапішыце крылатыя выразы з твораў Кандрата Крапівы. (*Максімальная колькасць балаў — **1,5***).

1. *Мне часта крыкуны мільгаюць у вачах,*
*Да славы прагныя* ____________________

2. *Парсюк не надта быў ахвочы*
*Глядзецца* ________________

3. *Ды знойдуцца заўсёды Івановы,*
*Што* _______________________

**Заданне 11.** Растлумачце значэнне фразеалагізмаў:

у камізэльку плакаць –

хварэць на пана –

як пугаю па вадзе –

надзьмуўся, як мыш на крупы –

весці рэй –

спаліць за сабой масты –

воўк у авечай скуры –

дзесятаму заказаць –

закрануць за жывое –

шыта белымі ніткамі –

іграць першую скрыпку –

# Раздзел 3. ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ

**Пытанні.** Фанетычная сістэма беларускай мовы. Галосныя і зычныя гукі, іх класіфікацыя. Моцныя і слабыя пазіцыі гукаў. Пазіцыйныя чаргаванні гукаў (фанетычныя законы). Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Фанетычная транскрыпцыя.

**Заданне 1.** Выпішыце з верша словы, у якіх адлюстраваны асаблівасці беларускай фанетыкі ў галіне з ы ч н ы х. У квадратных дужках пакажыце, як вымаўляюцца гэтыя гукі. Кожны выпадак патлумачце адпаведным арфаэпічным правілам.

*Максімальная колькасць балаў – **6** (**1** бал за кожнае арфаэпічнае правіла)*

| **Словы з тэксту** | **Арфаэпічнае правіла** |
|---|---|
| | |

| | |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

## ПАМЯЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Ён рэлігійны. Ён святы.
Каб гэтак верыць, гэтак верыць,
Што голас будзе з нематы,
Што ёсць адчыненыя дзверы;
Што ўсвядоміцца народ
Сярод завеяў і адвеяў;
Што ўжо спыніўся перарод,
Што ўжо світанне ціха спее.
Ён рэлігійны. Ён святы.
"Я быў. Я ёсць. Я вечна буду",—
Сказаў з-пад небнай пекнаты,
Бо верыў і сабе, і люду… *( І. Чыгрын)*

**<u>Заданне 2</u>**. Націск часам дае магчымасць адрозніць граматычныя формы таго самага слова. Падкрэсліце пары такіх формаў, абазначце націскі ў словах. *Максімальная колькасць балаў* **— 5** .

Дару́чы́ць, ска́за́ў, стру́ны́, кава́лі́, му́зы́ка, тра́вы́, ба́цькі́, лі́чы́ць, па́ра́, ка́па́ць, дра́жні́ць, ста́лы́, ра́і́шча, ка́ра́, ста́лы́, ру́кі́, пла́чу́, ра́ды́, рассы́па́ць, вя́за́ў.

**<u>Заданне 3.</u>** Запішыце парамі як мага больш адпаведных беларускіх і рускіх слоў, што маюць націск на розных складах. Націскі абазначце. ***1*** *бал за пару.*

**<u>Заданне 4</u>**. Згрупуйце наступныя словы па колькасці гукаў у канчатку.

Школа, ляснога, дом, сіняе, вясною, вялікая, цень, рэч, зямля, лінія, ураджай, залатое, пішаце.

**Заданне 5.** Падкрэсліце з наступных слоў тыя, у якіх ёсць толькі гукі, што ўтрымліваюцца ў словах: ***кусты, мільён, рэпа.***

Кіно, клуб, лёд, мятла, нумар, паз, пісар, пояс, рэйка, прышчэк, рэзка, рубка, сад, салют, сіта, слесар, смык, сумесь, юнак, ястраб.

**Заданне 6.** Запішыце прапанаваныя ніжэй словы ў фанетычнай транскрыпцыі, падзяляючы іх на склады ў адпаведнасці з законам узрастаючай гучнасці. Пастаўце націскі. *Максімальная колькасць балаў — **5**.*

Н..д..бразычлівасць —
н..мн..гаслоўны — к..рпун —
к..штарыс — магд..бургскае —
н..здзейсненасць — ра..кінуцца —
с..рцабіцце — ра..шчапляць —
дэз..нфекцыйны —

**Заданне 7.** Затранскрыбіраваны тэкст без падзелу на фанетычныя словы запішыце згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі. *Максімальная колькасць балаў — **2.** За любую дапушчаную памылку здымаецца **0,5** бала.*

[прычоскаўхлопцабыласапраўдыакуратнайапасаваладавускагапрадаўгаватагатвар укароткʹійаваласокдаваласкабакʹэнбардытаксаманʹэвыдавалʹілʹішнʹімʹінаогулйонст арайэццанʹэатстацʹаччасубоносʹіцʹвыцʹвʹілыйаджынсыўапцʹашкувастраносыйатуфлʹ ізвысокʹімʹіапцасамʹі]

**Заданне 8**. Вызначце, якія гукі ёсць у слове ***яцвяжскі*** і колькі разоў кожны з іх сустракаецца ў сказе: *"І такой прыгажосцю надзяліў Гасподзь старонку нашу, што куды ні глянь, аж душы светла".* (Я. Баршчэўскі)

**Заданне 9**. Прачытайце. Вызначце і запішыце зычныя гукі, якія не ўтвараюць пары па звонкасці-глухасці, а ў прыкладах (адно-два словы) падкрэсліце літару, што абазначае адпаведны гук.

У кожнага свой Купала...
У мяне ён — само змаганне,
сама неўміручая прага
свабоды,
годнасці,
праўды,
сяброў. *(Е. Лось)*

**Заданне 10**. Вызначце, колькі разоў гукі, што ёсць у слове ***з'езд,*** сустракаюцца ў словах наступнага тэксту.

**Пакуль...**

Пакуль з пагардаю ад нас
Не адвярнуўся дух Купалы —
Пільнуйма зніч, каб не пагас,
Каб быў запас агню трывалы;
Каб, душы вывеўшы з турмы,
Як пад прысягаю, сурова
На свет на ўвесь сказалі мы
Сваё не сказанае слова. *(Ніл Гілевіч)*

**Заданне 11**. Вызначце, якімі гукамі адрозніваюцца пары слоў. Запішыце гэтыя гукі ў квадратных дужках.

*гуслі – яслі;* *сядзь – сад;* *ясень – вязень;*
*радон – раён;* *рэдка – рэдзька;* *вёў – вол;*

**Заданне 12**. Назавіце ў прыведзеным сказе галосныя гукі і санорныя. Чым санорныя адрозніваюцца ад звонкіх зычных?

Сапраўдны друг прыходзіць і тады,
Калі ад грому трэскаецца неба,
Калі няма каму падаць вады
Ці надзяліцца чэрствай лустай хлеба. *(С. Грахоўскі)*

**Заданне 13**. Вызначце, колькі гукаў і літар у слове ***двое***. Падлічыце, колькі разоў кожны з гукаў сустракаецца ў прыведзеным выказванні Н. Мацяш.

*Хто бездапаможны ў роднай мове — той невук, хоць ведае дзвесце моў.*

**Заданне 14**. Выпішыце словы, у якіх адлюстраваны асаблівасці беларускай фанетыкі. Запішыце гэтыя словы ў фанетычнай транскрыпцыі.

Пакуль яшчэ ў сівых дзядоў
У вуснах тояцца паданні;
Пакуль сланечнік будзіць зноў
Мяне ў вераснёўскім ранні;
Пакуль мы помніць будзем тых,
Хто ў святых баях забіты;

Пакуль вясновыя сады
Выводзяць птушак на арбіты;
Пакуль яшчэ ідуць у бой
З маной і раўнадушшам смела,—
То не загінуць мове той,
Што з вуснаў мацярок зляцела.
*(Н. Гальпяровіч)*

# Раздзел 4. МАРФЕМІКА

**<u>Пытанні</u>.** Корань, прыстаўка, суфікс, канчатак, постфікс, інтэрфікс. Аснова слова і яе віды: словазменная, словаўтваральная, формаўтваральная. Нулявыя суфіксы і канчаткі. Накладанне марфем. Марфемны разбор слова.

**<u>Заданне 1</u>.** Прааналізуйце прыведзеныя словазлучэнні і запішыце, што абазначаюць словы з прыстаўкаю ***-па.*** *Максімальная колькасць балаў* — ***3*** (***0,5*** *бала за кожнае правільна растлумачанае слова*).

1) пасарамаціць гультая —

2) пасароміць свавольнікаў —

3) жаданае памор'е —

4) своечасовая паверка —

5) спартыўны паядынак —

6) цікавае павер'е —

**<u>Заданне 2</u>.** Прыгадайце <u>10 дзеясловаў з каранямі</u>, якія з'яўляюцца назвамі <u>жывёл</u>, <u>птушак</u> ці <u>рыб</u>. Запішыце з гэтымі дзеясловамі неразвітыя сказы. *Максімальная колькасць балаў* — ***5*** (***0,5*** *бала за адзін сказ*).

**<u>Заданне 3</u>.** У вершы Я.Купалы "Свайму народу" ёсць такі радок: "*Табе, народ мой, <u>згібнуты</u> ў аковах…*", дзе ў падкрэсленым слове перад суфіксам -*ну*- маецца гук [*б*], які ў сучаснай літаратурнай мове не вымаўляецца і не перадаецца на пісьме ў аднакаранёвых словах (*загінуць, згінуць*). Пастарайцеся здагадацца і запісаць, які зычны стаяў на месцы, адзначаным прочыркам, у кожным з наступных дзеясловаў. Дакажыце гэта прыкладамі аднакаранёвых слоў. *Максімальная колькасць балаў* — ***4*** ( ***0,5*** *бала за кожны гук*).

| Дзеяслоў | Гук | Дзеяслоў | Гук |
|---|---|---|---|
| вяр_нуць | | гля_нуць | |
| пырс_нуць | | закра_нуць | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| вя_нуць | | зас_нуць | |
| та_нуць | | ускі_нуць | |

**Заданне 4**. Пісьмова адкажыце на наступныя пытанні. *Максімальная колькасць балаў* — **5.**

| | |
|---|---|
| **1.** Якое слова па сваёй семантыцы **выпадае з агульнага рада:** *ільняншчча, грачаншчча, бульбяншчча, папяншчча, люцэрншчча?* Падкрэсліце яго і патлумачце справа сваё рашэнне **(2 балы).** | |
| **2.** Хто **лішні** ў кампаніі дзяўчат: *сяброўка, каляжанка, манерка, швагерка, свякроўка?* Падкрэсліце **(0, 5 бала)** і патлумачце справа **(0,5 бала).** | |
| **3.** Як называюць: 1) *'снег, які толькі што выпаў'*? **(1 бал);** 2) *у вясельным абрадзе: месца (звычайна дзяжа, пакрытая кажухом), куды садзяць нявесту, часам жаніха'*? **(1 бал)** | |

**Заданне 5**. Пісьмова адкажыце на наступныя пытанні.

| | |
|---|---|
| **1.** Якое слова па сваёй семантыцы **выпадае з агульнага рада:** *сялянства, студэнцтва, духавенства, грамадзянства, чыноўніцтва?* Падкрэсліце яго і патлумачце сваё рашэнне (*1 бал*: **0,5** *бала за слова* + **0,5** *бала за тлумачэнне*) | |
| **2.** Хто **лішні** ў кампаніі музыкантаў: *флейтыст, раяліст, акардэаніст, гітарыст, альтыст, гарманіст?* Падкрэсліце яго (**0,5** бала) і патлумачце **(0,5** бала**).** | |

**Заданне 6**. Дадзены гукавыя комплексы **[знац'], [jікан'н'э], [уклат], [бајацца], [стајіц'],** якія ў пэўным кантэксце могуць мець канкрэтнае лексічнае і граматычнае значэнне. Пакажыце графічна, якім можа быць марфемны склад кожнага слова, складзенага з названых гукаў. *Максімальны бал* — **5** (**0,5** *бала за кожны ўказаны марфемны склад слова*).

| **Слова** | **Марфемны склад** |
|---|---|
| знаць | |
| іканне | |

| | |
|---|---|
| уклад | |
| баяцца | |
| стаіць | |

**<u>Заданне 7</u>.** Запішыце 10 суфіксаў, якія выкарыстоўваюцца ў бел. мове пры ўтварэнні <u>асабовых</u> назоўнікаў <u>муж. роду</u>, а таксама па 2 назоўнікі, утвораныя пры дапамозе гэтых суфіксаў. *Максімальны бал* — **5** (***1*** *бал* = ***1*** *суфікс* + ***2*** *назоўнікі*). Гл. узор на першым слове.

| **Суфікс** | **Назоўнікі** |
|---|---|
| 1. *-ак (-як)* | *асіл-ак, рыб-ак, мар-ак, бядн-як* |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**<u>Заданне 8</u>.** Падкрэсліце ў тэксце па 2 словы, марфемны склад якіх адпавядае наступным графічным схемам:



**Абазначце <u>лічбамі</u>**, якой з трох схем гэтыя словы адпавядаюць.

Ляжаць на далоні зерні...
Не верне зямля іх?.. Ці верне?..
Чысценькія такія,
Дагледжаныя і сухія,
Іх аддаваць страшліва
Нават зямлі ўрадлівай.
А што, калі сонца не знойдзе
І промень воддаль іх пройдзе?..
А што, як у цёмных нетрах
Не хопіць для іх паветра?..
І яны, нібы рыба на беразе,
Задыхнуцца ў раллі?..
І не верце, бо нават у жменях,
Як жывыя, варушацца зерні...
І ў пальцы дзяўбуць расткамі —
У руках прарастаюць самі.
Расшчапіце хутчэй далоні —
Не трымайце жыццё ў палоне!

*Я. Сіпакоў*

**Заданне 9.** Вызначце, якія з наступных слоў маюць прыстаўкі, і пазначце іх.

Абавязацца, абсушыць, абысці, абязлічыць, выдатнік, даатрымаць, залёт, занепакоены, нааблузваць, наапашкі.

**Заданне 10.** Пакажыце, як можна падзяліць на марфемы наступныя словы і як зменіцца пры гэтым іх значэнне. Да кожнага слова прывядзіце па 2 аднакаранёвыя словы:

| | |
|---|---|
| 1) адабраць — | адабраць — |
| 2) адорваць — | адорваць — |
| 3) выраз — | выраз — |
| 4) горка — | горка — |

**Заданне 11.** Абазначце ў кожным слове корань. Выпішыце пары аднакаранёвых слоў. Растлумачце, як называюцца карані, вызначаныя ў нявыпісаных словах. (**0,5** бала)

*Вадзянік, нізіна, вуліца, загарнуць, саліць, рэзаць, саліст, водны, сігаць, рэзкі, завулак, марскі, нізкавата, марыць, гаротны, дасягнуць.*

**Заданне 12.** Зрабіце марфемны і словаўтваральны аналіз слоў:

| Марфемны | Словаўтваральны |
|---|---|
| *бессмяротны* | *бессмяротны* ← |
| *разгублены* | *разгублены* ← |
| *перанаселенасць* | *перанаселенасць* ← |
| *садоўнік* | *садоўнік* ← |
| *выдатнік* | *выдатнік* ← |
| *брусніца* | *брусніца* ← |
| *лыжніца* | *лыжніца* ← |
| *па-людску* | *па-людску* ← |
| *пераразмеркаванне* | *пераразмеркаванне* ← |

| | |
|---|---|
| *адыходзіў* | *адыходзіў* ← |
| *змярцвелая* | *змярцвелая* ← |

**<u>Заданне 13</u>.** Падкрэсліце толькі словы з <u>дзвюма</u> літарамі ў корані. Пакажыце іх марфемны склад:

*апякаць, абутак, браць, дабаўка, двойка, замкнуць, звялы, звычка, пашыў, смех.*

**<u>Заданне 14</u>.** Вызначце марфемны склад слоў:

*старажытны, вярнуўшыся, напісана, паселішча, дазвалялася, насустрач , самастойна.*

**<u>Заданне 15</u>.** Абазначце канчаткі ў словах:

*трыма , пяцццюдзесяццю , чытаў , васьмюстамі , бараніліся, купацца, камусьці, чаго-небудзь.*

**<u>Заданне 16</u>.** Запішыце, якія часціны мовы могуць мець наступныя марфемы. Падмацуйце кожны выпадак прыкладамі.

***-я*, *-уч-* , *-яе*, *-ць* , *-ў* , *-ячы* , *я* □.**

# Раздзел 5. СЛОВАЎТВАРЭННЕ

**<u>Пытанні</u>.** Афіксальныя спосабы словаўтварэння: прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны (у тым ліку прыставачна-нульсуфіксальны), постфіксальны, прыставачна-постфіксальны, суфіксальна-постфіксальны, прыставачна-суфіксальна-постфіксальны, нульсуфіксальны. Спосабы складання: словаскладанне, асноваслоаскладанне, складана-суфіксальны спосаб, абрэвіяцыя.

**<u>Заданне 1</u>.** Запішыце <u>жаночыя</u> варыянты да прапанаваных мужчынскіх імён. *Максімальная колькасць балаў* — **4.**

<u>Узор</u>: *Алесь → Алеся.*

| | |
|---|---|
| Ян →<br>Сцяпан →<br>Міхал →<br>Павел → | Пятро →<br>Васіль →<br>Фёдар →<br>Стафан → |

**Заданне 2.** Размяркуйце наступныя словы паводле спосабу ўтварэння і назавіце яго. Зрабіце марфемны і словаўтваральны аналіз падкрэсленых слоў.

Шэравокі, бязрогі, развесяліцца, пераначаваць, палёт, пяцівугольнік, падгаворваць, умацоўваць, ружовенькі, нясмелы, жытнёвы, густалісты, бяздымны, прыдарожны.

**Заданне 3.** Запоўніце табліцу. *Максімальная колькасць балаў* — **4,5** (**0,5** *бала за кожную правільна запоўненую клетку*).

| **Вытворнае слова** | **Слова(ы), якое(ія) стала(і) базай для ўтварэння** | **Спосаб утварэння** |
|---|---|---|
| збегчыся | | |
| загс | | |
| | без рукі | |
| | сам | марфолага-сінтаксічны (або канверсія, транспазіцыя) |
| упарадкаваць | | |

**Заданне 4.** Выпішыце выдзеленыя словы. Пісьмова вызначце іх склад і спосаб іх утварэння.

Гарыць агонь. Каля *зямлянкі*

Аб доме тужаць *землякі*,

А маладыя *партызанкі*

Пякуць і сушаць *праснакі*. (*П. Глебка*)

**Заданне 5**. Пры вывучэнні словаўтварэння школьнікі, студэнты і выкладчыкі выкарыстоўваюць тэрмін ***словаўтваральная парадыгма*** — *'сукупнасць матываваных слоў, якія маюць адну і тую ж матывавальную аснову ці слова'*. У сучаснай беларускай мове словаўтваральная парадыгма можа налічваць ад 2 да 20 і больш членаў. Напрыклад,

грэць → | грэц***ца***
| грэ***дк***а і г. д.

Запішыце 10 слоў, якія ўваходзяць у словаўтваральную парадыгму да слова **чытаць**. *Максімальная колькасць балаў* — ***5.***

**Заданне 6**. Настаўнік прапанаваў вучню адказаць на пытанне, як маглі быць утвораны словы ***дзяржзаказ, зернясклад, каморнік, надхмар'е, бондар, піск, бландзін, мінулае*** *(успомнілася)*, ***загс, плытагон.*** Адказ атрымаўся наступны. Прааналізуйце гэты адказ, выпраўце і патлумачце дапушчаныя недакладнасці. ***(1*** *бал за кожнае слова з выпраўленай недакладнасцю)****.***

1. *Дзяржзаказ* утварылася ад словазлучэння *дзяржаўны заказ*, спосаб утварэння — абрэвіяцыя.

2. *Зернясклад* — ад словазлучэння *склад для зерня*, спосаб утварэння — словаскладанне.

3. *Каморнік* — ад слова *камора*, спосаб утварэння — суфіксальны.

4. *Надхмар'е* — ад *хмара*, спосаб утварэння — прыставачна-суфіксальны.

5. *Бондар* — ад слова *бонда*, спосаб утварэння — суфіксальны.

6. *Піск* — ад дзеяслова *пішчаць*, спосаб утварэння — нульсуфіксальны.

7. *Бландзін* — слова невытворнае.

8. *Мінулае* — слова невытворнае.

9. *Загс* — ад спалучэння *аддзел забеспячэння афармлення грамадзянскіх службаў*, спосаб утварэння — абрэвіяцыя.

10. *Плытагон* — ад словазлучэння *ганяць плыты*, спосаб утварэння — складана-нульсуфіксальны.

**Заданне 7**. Да кожнага з вытворных слоў напішыце ўтваральную аснову (базу). Графічна абазначце словаўтваральныя сродкі.

| | |
|---|---|
| *пагрузачны* ← | *канюшня* ← |
| *перагрузка* ← | *куплены* ← |

| | |
|---|---|
| *назіральны ←*<br>*адсталасць ←*<br>*паўтарэнне ←*<br>*сустрэчны ←*<br>*засушлівы ←*<br>*гоначны ←* | *салёны ←*<br>*паказчык ←*<br>*бурлівісты ←*<br>*воклiч ←*<br>*садоўнік ←* |

**Заданне 8**. Зрабіце словаўтваральны разбор наступных слоў:

| **Базавае(ыя) слова(ы)** | **Утворанае слова. Фарманты** | **Спосаб утварэння** |
|---|---|---|
| 1) | *раззбраенне* | |
| 2) | *адмыслова* | |
| 3) | *блакіт* | |
| 4) | *мастацкі* | |
| 5) | *паўтарэнне* | |
| 6) | *вадаправодны* | |
| 7) | *прыдарожны* | |
| 8) | *прыгажосць* | |
| 9) | *подпіс* | |

**Заданне 9.** Прыдумайце па 6 складаных прыметнікаў са злучальнымі галоснымі і запішыце іх. Назавіце спосабы іх утварэння.

**Заданне 10.** Растлумачце, якой прыметай матывавана кожнае выдзеленае ў тэксце слова.

Не выбіраем,
Спрытна зразаем
Шапкі, галоўкі
***Абабкам,***
***Радоўкам,***
***Ваўнянкам,***
***Бялянкам,***
***Таўстушкам,***
***Гаркушкам.*** *(Хв. Жычка)*

**Заданне 11**. Расшыфруйце абрэвіятуры.

СЭУ ←
ДТСААФ ←
МЗС ←
ЗБС "Бацькаўшчына" ←
НЛА ←
СНД ←
СНІД ←
МВФ ←
МУС ←
РАУС ←
ТБМ ←
СБМ ←
ТСБМ ←
РБС ←

**Заданне 12**. Зрабіце марфемны і словаўтваральны аналіз слоў:

*бессмяротны*

*някідкай*

*прыгарадны*

*разгублены*

*перанаселенасць*

*садоўнік*

*выдатнік*

*брусніца*

*лыжніца*

*па-людску*

**Заданне 13**. Зрабіце марфемны і словаўтваральны аналіз слоў:

*пераразмеркаванне*

*непаваротлівы*

*пераадолець*

*падвечар*

*адыходзіў*

*неспазнанае* (жыццё)

*змярцвелая*

*даляглядах*

*беллю*

*завыванне*

*аціхла* (завея)

*уздоўж* (платоў)

(Некампетэнтнасць складальнікаў задання: ці ж можна для марфемнага аналізу падаваць апошняе слова?)

**Заданне 14.** Зрабіце марфемны і словаўтваральны разбор наступных слоў. *(3 балы).*

*пагор'е*

*вяртлявая*

*імшанік*

*вершаліна*

*раскарчаваная*

*старасвецкі*

# Раздзел 6. МАРФАЛОГІЯ

## Тэма 6. НАЗОЎНІК

**Пытанні.** Катэгорыя роду назоўнікаў. Род нязменных назоўнікаў. Род абрэвіятур. Адрозненні ў родзе назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Катэгорыя ліку назоўнікаў. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі.

Скланенне назоўнікаў. Назоўнікі 1-га скланення і рознаскланяльныя. Канчаткі назоўнікаў 1-га скланення і рознаскланяльных у **Д., Т., М. скл.** Назоўнікі 2-га і 3-га скланенняў. Канчаткі назоўнікаў м. р. адз. л. з чыстай асновай у **Р. скл.** адз. л. і ў **М. скл.** адз. л. Змешанае скланенне назоўнікаў. Канчаткі назоўнікаў множнага ліку. Скланенне імён, прозвішчаў і геаграфічных назваў. Назоўнікі нулявога скланення.

**Заданне 1.** Запішыце беларускія адпаведнікі да наступных зборных назоўнікаў. *Максімальная колькасць балаў* **— 4 (0,5** *бала за кожнае слова).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Стерня –* | | *Штакетник –* | |
| *Кустарник –* | | *Шиповник –* | |
| *Земляничник –* | | *Осокарник –* | |
| *Черничник –* | | *Березник –* | |

**Заданне 2.** Перакладзіце на беларускую мову:

железнодорожная насыпь –

неправильная дробь –

третья перепись –

некачественный гонт –

древнерусская летопись –

едкая гарь –

кислый щавéль –

гречневая крупа –

пойти за водою –

жениться на студентке –

пойти за водою –

поблагодарить брата –

сердечное спасибо –

старшие сестры –

**Заданне 3.** Запішыце словы па-беларуску, дапасаваўшы да іх прыметнікі.

живопись –

риск –

паводок –

стебель –

бровь –

ежевика –

блюдце –

искренность –

земляника –

гусь –

шинель –

накипь –

**<u>Заданне 4</u>**. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Вызначце <u>род</u> <u>назоўнікаў</u> у рускай і беларускай мовах.

Олимпийская медаль –

бескрайняя степь –

горькая полынь –

новый кафель –

чёрный тополь –

охотничья собака –

выгодная продажа –

густая тень –

белый цыплёнок –

птенец кукушки –

стеклянная банка –

одна бровь –

спелое яблоко –

портретная живопись –

собственное мнение –

**<u>Заданне 5</u>**. Пастаўце словазлучэнні ў форму адзіночнага ліку. Запішыце. *Максімальная колькасць балаў* — **4.**

| **Мн. л.** | **Адз. л.** |
|---|---|
| суседавы вашчыны – | |
| новыя тарбасы́ – | |
| высокія жырафы – | |
| дамашнія тапкі – | |
| белыя рамонкі – | |
| цёплыя чарэні – | |
| чорныя лебедзі – | |
| чалавечыя цені – | |

**Заданне 6.** Падкрэсліце ў кожным радзе **чацвёртае** **лішняе** слова. У дужках коратка патлумачце свой выбар.

а) вароты, азёры, дамы́, сталы;

б) задавака, дзяўчына, задзіра, валацуга;

в) радасць, цень, ростань, восень;

г) Сочы, Тбілісі, Осла, Місісіпі.

**Заданне 7.** Запішыце словазлучэнні ў адзіночным ліку.

| Мн. л. | Адз. л. |
|---|---|
| дзікія гусі – | |
| чорныя бровы – | |
| чыгуначныя насыпы – | |
| службовыя сабакі – | |
| смачныя яблыкі – | |
| мае туфлі – | |
| атрыманыя бандэролі – | |
| зорныя россыпы – | |
| доўгія цені – | |
| балючыя мазалі – | |

**Заданне 8.** Пастаўце назоўнікі ў патрэбнай склонавай форме і дапішыце ў словазлучэннях канчаткі.

Разам з (Максім Лужанін ), жменя (жвір ), стаяць на (бераг ), выступіць на (мітынг ), стол з (дуб ), дзякаваць (настаўнік ), ляцець над (Жлобін ), экскурсія па (Нясвіж ), пазнаёміцца з (Коля ), вецер з (лес ), многа (пясок ), жыў пры (дзядуля ), гнацца за (гусь ), пляма на (брыль ), сумаваць па (Янка Брыль ), прыпынак па (патрабаванне ), разам з (Вася ), ішлі з (Шамякін ), спевы птушак у (гай ), сустрэча пад (Крычаў ), сябраваць з (Кастусь Салоха і Сяргей Барысаў ), ляцець над (Барысаў ), скончыць школу з (медаль ), грукаць па (шкло ).

**Заданне 9**. Пастаўце назоўнікі ва ўказаных склонах.

| Н. скл. | Р. скл. | Н. скл. | Т. скл. |
|---|---|---|---|
| 1) луг – | | 1) шаль – | |
| 2) лес – | | 2) пляцень – | |
| 3) твар – | | 3) боль – | |
| 4) хлеб – | | 4) верф – | |
| 5) унук – | | 5) моль – | |
| 6) геній – | | 6) жаль – | |
| 7) калектыў – | | 7) глыб – | |
| 8) магніт – | | 8) золь – | |
| 9) вылет – | | 9) шоль – | |
| 10) мох – | | 10) таполя – | |

**Заданне 10.** Запішыце назоўнікі ў форме М. склону. Растлумачце, ад чаго залежыць правапіс канчаткаў у гэтых словах у М. склоне.

| Н. скл. | М. скл. | Н. скл. | М. скл. |
|---|---|---|---|
| інстытут | | гай | |
| сакавік | | мір | |
| вецер | | падарожжа | |
| двор | | гаспадар | |
| возера | | сцежка | |
| стог | | Васіль Дзяцел | |
| кажух | | ліпень | |
| Саша Дрозд | | Віцебск | |

**Заданне 11.** Вызначце род і скланенне наступных назоўнікаў.

| Назоўнік. Род | Скланенне | Назоўнік. Род | Скланенне |
|---|---|---|---|
| жыта | | калгас | |
| Расія | | старшына | |
| гімназія | | старшыня | |
| дзядзька | | самавучка | |
| бацька | | ціхоня Вася | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| хвоя<br>восень<br>гарох<br>зерне<br>канікулы<br>Асіповічы<br>срэбра<br>Кузьма Чорны<br>задзіра<br>гуляка<br>сведка<br>тамада<br>Свіслач<br>Пціч<br>Максім<br>ягня<br>цяля<br>дзіця<br>дзядуля<br>Міхась Чарот<br>Залессе<br>Віталь Сарокін<br>Янка Купала<br>Васіль Сухамлінскі<br>Жан Русо<br>Мінск<br>Гродна<br>Чарнігаў<br>Ян Грыбоўскі<br>Дзмітрый Пісараў<br>Мікола Янчук<br>Грыбаедаў | | суддзя Васільеў<br>каноплі<br>грудзі<br>Святлана Кухто<br>Змітрок Бядуля<br>танга<br>інтэрв'ю<br>гуляка Кузьма Саўка<br>Рыгор Сямашка<br>Чылі<br>Бразілія<br>Сінгапур<br>Кіпр<br>вёска Савічы<br>БАМ<br>Уфа<br>шыпшына<br>мінулае<br>марожанае<br>прыёмная<br>сакратар<br>дырэктар<br>рунь<br>Павел Серада<br>цымбалы<br>хараство<br>Ігнат Бародка<br>племя<br>семя<br>Іван Шамякін<br>Мікола Скурко | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| край<br>Соня Сокалава<br>Эдзіт Піяф<br>Іван Лемяшэвіч<br>Адам Гурло<br>М. Багдановіч<br>турнэ | | Анатоль<br>Вярцінскі<br>г. Валожын<br>Нёман<br>Сож<br>Днепр<br>Нарач | |

**Заданне 12.** Вызначце разрад назоўнікаў паводле адушаўлёнасці / неадушаўлёнасці: *інтэлігент* – , *людзі* – , *апостал* – , *нацыя* – , *чалавецтва* – , *беларус* – .

**Заданне 13.** У кожным радзе слоў падкрэсліце "лішняе" слова. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

а) вада, кісель, лён, ручнік, цукар;
в) азёры, вароты, дамы́, кусты, сталы́;
е) студзень, стэп, гусь, цень, боль, насып, шынель.

# Тэма 7. ПРЫМЕТНІК

**Пытанні.** Разрады прыметнікаў паводле значэння. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Памылкі пры ўжыванні ступеней параўнання прыметнікаў. Выражэнне прыналежнасці ў беларускай мове. Правапіс суфіксаў прыметнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў прыметнікаў.

**Заданне 1.** Вызначце разрады прыметнікаў па значэнні.

*Залатыя рукі, залаты гадзіннік, Купалава паэма, купалаўскі стыль, воўчы след, воўчы апетыт, вішнёвы сад, вішнёвыя вочы, лісіная хітрасць, лісіная нара, лісіны каўнер.*

**Заданне 2.**Ператварыце словазлучэнні "назоўнік + назоўнік" у словазлучэнні "прыметнік + назоўнік" і запішыце.

Аловак Наташы –

Верш Броўкі –

Гадзіннік Васі –

гняздо ластаўкі –

Касцюм дзядулі –

Сарафан бабулькі –

Хатка бабра –

Хустка сястры –

Слёзы маткі –

Песні Васілінкі –

**Заданне 3.** У кожным радзе слоў падкрэсліце ”лішняе” (у тым ліку “няправільнае”) слова. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

а) *высокі, разумны, драўляны, сухі, прыгожы;*

б) *свінцовыя вочы, стальныя нервы, жалезны тон, залаты характар, кляновы ліст;*

в) *Коласава слова, дзедавы медалі, вавёркава дупло, Сашава абяцанне, Андрэева дачка.*

**Заданне 4.** Утварыце ад назоўнікаў прыналежныя прыметнікі, запішыце з імі словазлучэнні.

| | |
|---|---|
| Жэня -- | дзядуля -- |
| сябар -- | Васіль -- |
| сяброўка -- | Васіліна – |
| гаспадыня -- | Толя -- |
| Саша -- | сінічка -- |
| ўдава -- | бабуля -- |

**Заданне 5.** Ад геаграфічных назваў утварыце адносныя прыметнікі.

| | |
|---|---|
| Азія -- | Дуброўна -- |
| Баку -- | Жабінка -- |
| Боснія -- | Іўе -- |
| Бяроза -- | Калумбія -- |
| Бярэзіна -- | Камбоджа -- |
| Васілішкі -- | Каліфорнія -- |
| Юрацішкі -- | Конга -- |
| Ветка -- | Карма -- |
| Вікторыя -- | Лёзна -- |
| Вісла -- | Коста-Рыка -- |
| Вогненная Зямля -- | Любча -- |
| Гаіці -- | Марока -- |
| Гарадзішча -- | Масты -- |
| Пціч -- | Слуцк -- |
| Случ -- | Убарць -- |

**Заданне 6.** У беларускай мове ў мастацкім стылі для выражэння прыналежнасці асобе ці жывёле ў асноўным ужываюцца прыналежныя прыметнікі, а ў дзелавым і навуковым стылях — часцей родны склон назоўніка (гэта граматычная норма рускай мовы). Замяніце, **дзе можна**, форму выражэння прыналежнасці на сінанімічную — **з прыналежным прыметнікам.**

*Нара **барсука** --*

*Парада **бацькі** --*

*Рукі **матулі** --*

*Заклікі **партыі** --*

*Сын **Пятра Анатолевіча** --*

*Цацка **Толі** --*

*Кажушок **Міхаські** --*

*Сэрца **Ганулькі** --*

*Доля адзінокіх **старых** --*

*Зарплата **лабаранта** Воінавай --*

*Дупло **вавёркі** --*

*Творы **С. Грахоўскага** --*

*Верш **Р. Барадуліна** --*

*Проза **Я. Сіпакова** --*

**Заданне 7.** Ад дадзеных слоў утварыце ўсе магчымыя формы ступеней параўнання і занясіце іх у адпаведныя раздзелы табліцы. Растлумачце, чаму ад некаторых прыметнікаў немагчыма ўтварыць ніводную форму ступеней параўнання.

**1.** Слабы, маленькі, яснавокі, звычайны, чорны, эфектыўны, велічэзны, бронзавы, блізкі, зручны, смачны, белагруды, звышімклівы.

**2.** Глыбокі, глыбокапаважаны, вялізны, **велізарны,** апантаны, настойлівы, патрэбны, шарападобны, інфрачырвоны, архіважны, ядавіты, жоўты, правільны, левы, фальшывы, неабсяжны, сонны, аднарукі, светла-ружовы, мудры.

| **Простая форма** | | **Складаная форма** | |
|---|---|---|---|
| Вышэйшая ступень | Найвышэйшая ступень | Вышэйшая ступень | Найвышэйшая ступень |
| | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |

# Тэма 8. ЛІЧЭБНІК. ЗАЙМЕННІК

**Пытанні.** Разрады лічэбнікаў. Скланенне і правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі. Абазначэнне прыблізнай і няпэўнай колькасці. Правапіс лічэбнікаў. Разрады і правапіс займеннікаў.

**Заданне 1.** Запішыце лічэбнікі словамі.

*Альбом з **847** фотаздымкамі –*

***345-мільённы** жыхар –*

*Дамова з **329** краінамі –*

***274-ы** наведвальнік –*

**Заданне 2.** Запішыце спалучэнні словамі ў **Т. склоне**.

8 секунд –

80 метраў --

800 радкоў --

50 станкоў --

500 машын --

300 жыхароў --

200 дзён --

7000 кніг --

паўтары тысячы рублёў --

1692 словы --

**Заданне 3.** Раскрыйце дужкі і запішыце лічэбнікі словамі ва ўказаным склоне.

1) **Т. скл.** 259000 рубл(ёў, ямі)

2) **Н. скл.** 32 $^4/_5$ гектар(а, аў)

3) **М. скл.** 862130 кніг(□, ах)

4) **Н. скл.** 223 $^3/_4$ тон(□, ы)

**Заданне 4.** Падбярыце да лічэбнікаў назоўнікі і запішыце ўтвораныя словазлучэнні ў **Т. склоне**. Лічбы запісвайце словамі.

668 --

900-ы --

412 --

$^3/_{15}$ -

0, 02 --

$^4/_5$ -

3,003 –

64,3 --

213 --

311-мільённы --

**Заданне 5.** Выпішыце з тэксту **лічэбнікі** і запішыце іх словамі **ў Т. склоне.** Вызначце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца падкрэсленыя словы.

Колькі стралялі зуброў у Белавежы!

Восень, 27 верасня 1752 год. Кароль Аўгуст III палюе. Разам са сваёй жонкай — вялікай каралеваю. У гэты дзень яе вялікасць каралева забіла 20 зуброў і прачытала каля 50 старонак сентыментальнага рамана.

1860 год. Таксама верасень. Палюе цар Аляксандр II. З усёй пушчы пад яго стрэлы было сагнана 117 зуброў, 100 зайцаў, 3 ласі, 23 дзікі, 36 коз, 14 ланяў, 17 ваўкоў, 15 ліс, 14 барсукоў. Усяго 339 галоў.

Але зубр, нягледзячы на здзек і ганьбаванне, не пакінуў сваю Белавежу. Вучоныя нават зрабілі вывады, што пушча захавалася толькі таму, што ў ёй былі зубры, а зубры захаваліся толькі таму, што была пушча. *(Паводле Я. Сіпакова)*

**Заданне 6.** Укажыце катэгарыяльнае значэнне (часцінамоўную прыналежнасць) і граматычныя асаблівасці слова **адзін** у наступных сказах. Максімальная колькасць балаў — **4** (**1** бал за правільна запоўненую клетку).

| С к а з ы | Катэгарыяльнае знач., граматыч. асаблівасці слова ***адзін*** |
| --- | --- |
| Пастухі, ***адзін*** ужо ў немаладых гадах, марудлівы і паважны, другі намнога маладзейшы, порсткі і рухавы, няспешна пасоўваючыся за чарадой, то сыдуцца разам, то зноў разыдуцца ў бакі *(В. Гардзей)*. | |
| Хлопцы, якія стаялі каля дуба, былі ***адных*** гадоў з намі. | |
| Паэзія валодае ***адной*** дзіўнай уласцівасцю: яна вяртае слову першапачатковую свежасць. | |
| ***Адны*** зоркі ўзрадаваліся першаму марозу, бо свяцілі ярчэй, чым у цёплыя летнія ночы. | |

**Заданне 7.** У кожным радзе слоў падкрэсліце "лішняе" слова. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

а) чацвёра, трэці, паўтара, чвэрць, тры, адна трэцяя;
б) трохтысячны, другарадны, удзвюх, двойчы, двайны, другасны.
в) удваіх, двое, чатыры, пяць, адна пятая, паўтары;
г) тройка, пяцёра, ушасцёх, ушасцярых, па-трэцяе, трайны.

**Заданне 8.** Перакладзіце на беларускую мову. У тэксце перакладу падкрэсліце займеннікі. Вызначце іх сэнсавы разрад і зменныя марфалагічныя прыметы.

Человеку важно знать свои корни — отдельному человеку, семье, народу. Тогда и воздух, которым мы дышим, будет целебен и вкусен, дороже будет взрастившая нас земля и легче будет почувствовать назначение и смысл человеческой жизни. Давайте же будем помнить об этих корнях. *В. Песков*

**Заданне 9.** Выпішыце ў табліцу са сказаў словазлучэнні 'займеннік *сам, сама́, само + назоўнік*' у адпаведнасці з указанымі функцыямі такіх словазлучэнняў. *Максімальная колькасць балаў* — **3.**

| ФУНКЦЫІ | СЛОВАЗЛУЧЭННЕ |
|---|---|
| 1) удакладняе пэўную асобу, вылучае яе з ліку іншых асоб: | |
| 2) указвае на самастойнасць у выкананні пэўнага дзеяння: | |
| 3) указвае на важнасць, знакамітасць дзеючай асобы: | |

1. Сам Дубовік не адолеў бы такую даміну пабудаваць *(У. Краўчанка)*. 2. А пры жаданні, пры ахвоце сам чорт не страшан у балоце! — сказаў Міхал на словы брата, сказаў рашуча і заўзята *(Я. К-с)*. 3. Сама ж Таня маўчыць горда *(Я. К-с)*. 4. Сама Алена з зямлёй не справіцца *(Я. К-с)*. 5. Больш за ўсіх стараўся сам паэт *(Я. К-с)*. 6. Цягнік прыпыніўся ля самага семафора *(П. Кавалёў)*. 7. Той хадзіў па воласці, як сам цар, крычаў, аж шыбы бражджалі *(Я. К-с)*.

**Заданне 10.** У кожным радзе слоў падкрэсліце "лішняе" слова. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

а) мой, свой, той, твой, іх, іхні, ягоны, наш;
б) гэтая, яна, тая, такая, гэтакая;
в) самы, сам, увесь, усялякі, інакшы, усялякі, любы, кожны, іншы, ніякі.
г) хто, што, які, чый, каторы, чый-небудзь.

# Тэма 9. ДЗЕЯСЛОЎ. ГРАМАТЫЧНЫЯ ФОРМЫ ДЗЕЯСЛОВА

**Пытанні.** Асновы дзеясловаў. Спражэнні дзеясловаў. Правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў у абвесным і загадным ладах. Рознаспрагальныя дзеясловы. Правапіс суфіксаў дзеясловаў.

Дзеепрыметнік. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў. Памылкі ва ўжыванні дзеепрыметнікаў. Сродкі перакладу дзеепрыметнікаў, не характэрных беларускай мове. Дзеепрыметны зварот.

Дзеепрыслоўе. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўяў. Памылкі ва ўтварэнні і ўжыванні дзеепрыслоўяў. Дзеепрыслоўны зварот.

**Заданне 1.** Ад прыведзеных дзеясловаў утварыце аснову інфінітыва і аснову цяперашняга (будучага) часу.

| *Дзеяслоў* | *Аснова інфінітыва* | *Аснова цяп. (буду.) часу* |
|---|---|---|
| сказаць | | |
| напісаць | | |
| аддаць | | |
| аддаваць | | |
| заходзіць | | |
| стаяць | | |
| уставаць | | |
| устаць | | |

**Заданне 2.** На ўступным экзамене быў атрыманы адказ: "*Дзеяслоў* ***даць*** *адносіцца да* ***I*** *спражэння: даю, даеш, дае, даём, даяце, даюць*". Што вы можаце на гэта сказаць? Абгрунтуйце свой адказ.

**Заданне 3.** Вызначце спражэнне дзеясловаў, укажыце іх трыванне. Запішыце дзеясловы ў форме 2-й ас. мн. ліку цяперашняга ці будучага простага часу. Абазначце канчаткі.

| *Дзеяслоў* | *Спраж.* | *Трыванне* | *2-я ас. мн. ліку цяп. (буд.) часу* |
|---|---|---|---|
| жыць | | | |
| забегчы | | | |
| дагледзець | | | |
| адпачыць | | | |
| застацца | | | |
| сутыкнуцца | | | |
| класці | | | |
| прачнуцца | | | |
| заставацца | | | |
| аднесці | | | |

**<u>Заданне 4.</u>** Успомніце правапіс суфіксаў дзеясловаў ***-ава- (-ява-), -ва-, -ыва- (-іва-)*** і перакладзіце словы на беларускую мову, абазначце ў іх суфіксы.

| **Па-руску** | ***На-беларуску*** | **Па-руску** | ***На-беларуску*** |
|---|---|---|---|
| засаливать | | переваривать | |
| подкармливать | | расследовать | |
| подписывать | | разгадывать | |
| овладевать | | подклеивать | |
| обмениваться | | выглаживать | |
| надаивать | | утаивать | |
| проветривать | | намыливаться | |
| совершенствоваться | | обследоваться | |
| раскалываться | | возглавлять | |

**<u>Заданне 5.</u>** Вызначце спражэнне дзеясловаў і запоўніце табліцу па ўзоры. Вусна растлумачце правапіс невыразных галосных. Якой тыповай памылкі трэба асцерагацца пры ўжыванні дзеясловаў у форме 2-й ас. мн. л.?

| *Неазнач. форма* | *3-я ас. адз. л.:* ***ён*** | *2-я ас. мн. л.:* ***вы*** |
|---|---|---|
| вы́хадз**і**ць II спр. | вы́хадз-**іць** | вы́хадз-**іце** |
| узяцца **I** спр. | во́зьм-**е**-цца | во́зьм-**еце**-ся |
| засцерагчы | | |
| паклікаць | | |
| сядзець | | |
| імкнуцца | | |
| страц..ць | | |
| падгледз..ць | | |
| здаць | | |
| скласці | | |
| забраць | | |
| выдаваць | | |
| пазнаём..цца | | |
| адысціся | | |
| перадаць | | |

| | | |
|---|---|---|
| увайсці<br>панесці<br>разгледз..цца | | |

**Заданне 6**. Ад дзеясловаў утварыце ўласцівыя беларускай мове дзеепрыметнікі. Абазначце суфіксы ў дзеепрыметніках.

| *Дзеяслоў* | *Дзеепрыметнік* | *Дзеяслоў* | *Дзеепрыметнік* |
|---|---|---|---|
| змалоць | | абсмяяць | |
| абмалаціць | | абклеіць | |
| прыручыць | | прыгарадзіць | |
| выпіць | | збіць | |
| зашкліць | | застыць | |
| зберагчы | | пабялець | |
| узгадаваць | | пастарэць | |
| сцерці | | пачырванець | |

**Заданне 7**. Ад прапанаваных дзеясловаў утварыце адпаведныя формы (для дзеясловаў — абвесны лад будучы час). Запішыце ў табліцу. *Максімальная колькасць балаў* — ***4,5***.

| **Дзеяслоў** | **2-я ас. адз. л. абвеснага ладу** | **2-я ас. мн. л. абвеснага ладу** | **Дзеепрыслоўе** |
|---|---|---|---|
| распачаць | | | |
| распасцерці | | | |
| распаразаць | | | |

| **Дзеяслоў** | **Інфінітыў** |
|---|---|
| разлучыліся | |
| перамаўляюцца | |
| выліваліся | |
| выращаюць | |

**Заданне 8**. У кожным радзе слоў падкрэсліце "лішняе" слова. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

а) звечарэла, развіднела, пацяплела, прынесла, сцямнела;
б) бегчы, несці, ляцець, ехаць, вазіць;
в) махнуць, маўчаць, слухаць, уцалець, стукнуць;
г) дрыжаць, верашчаць, падлічыць, закрэсліць, адпачыць.
д) збегчы, вісець, залежаць, стаяць, аформіць;
е) адпачнуць, упісацца, здарацца, наесціся, пастукваць.

**Заданне 9.** Падкрэсліце словазлучэнні з формамі дзеепрыметнікаў, якія не адпавядаюць нормам беларускай мовы. Выпраўце памылкі.

1) працягваемая гутарка; 2) уважліва слухаючы сын; 3) атрымаўшыеся малюнкі; 4) уцалелы кавалак лесу; 5) змолатае зерне; 6) сурова насупленыя бровы; 7) парослыя мохам купіны; 8) заінетыя дрэвы; 9) зачырванеўшаяся ад марозу дзяўчынка; 10) зарослы травою ручай; 11) засмажанны кавалак; 12) асветляныя сонцам паляны; 13) засыплены лісцем; 14) куплены на ўласныя грошы.

**Заданне 10.** Утварыце ад дзеясловаў дзеепрыслоўі. Абазначце ў іх суфіксы.

| *Дзеяслоў* | *Дзеепрыслоўе* | *Дзеяслоў* | *Дзеепрыслоўе* |
|---|---|---|---|
| касіць | | здабываць | |
| лічыць | | вярнуцца | |
| марыць | | уваходзіць | |
| прыручаць | | увайсці | |
| верыць | | піць | |
| паверыць | | трапіць | |
| дастаць | | паведаміць | |

**Заданне 11.** Утварыце ад дзеясловаў магчымыя формы дзеепрыслоўяў. Абгрунтуйце ўжыванне выбранага вамі суфікса. Памятайце, што ад кожнага дзеяслова можна ўтварыць толькі **адно** дзеепрыслоўе.

| *Словазлучэнне* | *Дзеепрыслоўе* | *Словазлучэнне* | *Дзеепрыслоўе* |
|---|---|---|---|
| тушыць агонь | | затаіцца ў куце | |
| патушыць святло | | мінуць балота | |
| сагнуць у дугу | | страсянуць голлем | |
| бразнуць дзвярыма | | страсаць снег | |
| развесіць красёнцы | | абтрэсці шыгалле | |
| развешваць бялізну | | сцерці абцас | |
| старанна мыцца | | мінаць сенажаць | |
| наспех паснедаць | | адпусціць матылька | |
| выпускаць на волю | | звонка рассмяяцца | |

**Заданне 12.** Знайдзіце недакладнасці ў выкарыстанні дзеяслоўных формаў, выпраўце памылкі і запішыце сказы.

**1.** *Нельга знайсці сябра, здольнага, як Васіль, і падтрымаць, і суцяшаць.*
**2.** *Паглядзі — на старой вярбе свішча шпак-працаўнік заўзята. І пад песню яго табе ўспамянецца бацькава хата.*
**3.** *Кандрат Назарэўскі ў Зосіных вачах стаў колішнім чырвонаармейцам, якога яна спаткала было ў першыя свае маладыя гады.*
**4.** *Жывеце вы тут, дзякуй богу, спакойна.*
**5.** *Як добры стыліст, пісьменнік бачыў мастацкія вартасці дыялектызмаў і ўжывае іх даволі часта.*

**Заданне 13.** Перакладзіце сказы на беларускую мову. Прааналізуйце спосабы перакладу дзеепрыметнікаў.

**1.** *В вагоне у окна сидела читающая девушка.*

**2.** *Ещё издалека девушки увидели купавшегося в реке ребёнка.* —

**3.** *Хорошо владеющий музыкальным инструментом, он пленил всех.* —

**4.** *Проросшие побеги набирали силу.* —

**5.** *Рассказывающий попросил аудиторию успокоиться.* —

**6.** *Сторож, заметивший парней, приказал им остановиться.* —

**7.** *Ночные костры, светившиеся там и сям по лагерю, увеличивали темноту своим неярким багровым светом.* —

**8.** *Голос, певший песню, вдруг оборвался совсем близко около хаты, громко звякнула железная клямка, и в просвете быстро распахнувшейся двери показалась рослая смеющаяся девушка.*

**Заданне 14.** Выпішыце з тэксту 4 дзеясловы незакончанага трывання ў пачатковай форме, утварыце ад іх формы закончанага трывання і дзеепрыслоўі.
*Максімальная колькасць балаў – **4** (1 бал за кожнае слова).*

Восень -- гэта вечар года. Яшчэ *(н.)*даўна вось тут шапацела, шаргацела, жаўцела, свяцілася, святкуючы свой час, лагоднае бабіна лета. Былі такія раніцы і вечары калі нават мроілася што можна адчуць на дотык як кожны дзень робіцца ўсё карацейшы і карацейшы як пругка струменіць адыходзячы спяшаючыся лета. І сёння, праз колькі халодных дзён кастрычніка, зноў раскашуецца сонца і ціхая-ціхая цеплыня. Здаецца нават, што бабіна лета вярнулася зноў, каб адбыць у полі яшчэ некалькі дзён. Але ў полі *(н.,)* кога *(н.,)* дзе... *(Паводле Я. Сіпакова)*

| *Дзеяслоў незак. трыв.* | *Дзеяслоў закон. трыв.* | *Дзеепрыслоўе* |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 15.** Запішыце сказы, выправіўшы памылкі.

1. Кожны студэнт пры жаданні можа атрымаць у бібліятэцы спіс рэкамендуючай літаратуры.
2. Міхалка хацеў сказаць ёй што-небудзь вострае і зневажаемае.
3. Адзін з вучняў, устаўшы з-за парты, чакаў настаўніцкага прысуду.
4. Антось ніколі не бачыў чыста апранутых і сыта наетых сялян.
5. Вынутыя з вокнаў дубэльты аднеслі ў вазоўню.
6. Калісьці ў дзяцінстве — было яму тады гадоў дзесяць — ён пасвіў коні з адным хлопцам.

# Тэма 10. ПАЎТАРЭННЕ ЎСІХ ТЭМ

**Заданне 1**. Вы — рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура". Адзін з аўтараў, даслаўшы рукапіс свайго твора, папрасіў нічога ў тэксце не змяняць, а калі ўзнікне такая неабходнасць, то абавязкова патлумачыць, чаму былі зроблены праўкі. У рукапісе трапіўся наступны сказ. Што вы будзеце тлумачыць аўтару? *Максімальная колькасць балаў* — **4 (1** *бал за кожную выяўленую і патлумачаную недакладнасць***)**.

Адзінец немалады ўжо, шасцігадовы лось, падагнуўшы пярэднія ногі, увесь змакрэлы і абleплены ледзяшамі, ссунуўся з Жоўтага берага на каленях каля самай пячоры да прорубу ля берага ў Віліі і, апусціўшы гарачую пысу ў чорную ледзяную ваду, стаў смактаць, задыхаючыся, сапучы, і раз за разам паварочваючы галаву з цяжкімі прыледзянелымі рагамі назад, у бок Ямскага... *(І. Пташнікаў)*

**АДКАЗ:**

**Заданне 2**. Правільна суаднясіце інфармацыю правага і левага слупкоў. *Максімальная колькасць балаў — **2,5**.*

| | |
|---|---|
| А – лексічныя нормы | 1 – правільная пастаноўка націску |
| Б – арфаэпічныя нормы | 2 – правільная пабудова словазлучэнняў, сказаў |
| В – марфалагічныя нормы | 3 – правільная пастаноўка знакаў прыпынку |
| Г – пунктуацыйныя нормы | 4 – правільнае выкарыстанне формаў слоў |
| Д – акцэнталагічныя нормы | 5 – правільнае вымаўленне гукаў і іх спалучэнняў |
| | 6 – правільны выбар слова і дарэчнасць яго прымянення |

**А___, Б____, В____, Г____, Д____.**

**Заданне 3.** У кожным радзе слоў падкрэсліце ”лішняе” слова. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

а) Пухавічы, ЗША, грудзі, перагаворы, АЗС;
б) аматар, мінчанін, Мінск, АТС, шчасце;
д) а, але, аднак, бо, ды;
е) ні, бы, жа, нават, каб.

**Заданне 4**. Знайдзіце ў прыведзеных сказах памылкі. Выпраўце памылкі і запішыце сказы.

1. Калі гаварыць шчыра, дык за лубін адказвае аграном, бо ён яшчэ з восені ляжыць пад брызентам і пакрыўся цвіллю.
2. Сланечнікі ў гародчыку апусцілі прывялае лісце, схавалася ў засень, у цень усё жывое — куры, гусі, свінні. Сабака ляжыць побач з высалапленым языком.
3. На пастаянную работу патрабуецца супрацоўнік для канструктарскага аддзела, які мае вышэйшую адукацыю.
4. Высока ў небе раздаецца громкая песня жаваранка.
5. Дыспут доўжыўся амаль дзве гадзіны, бо кожны горача аспрэчваў сваё разуменне шчасця.
6. За некалькі тыдняў тры самых асноўных прамысловых раёны былі вызвалены ад ворага.
7. І справа, і злева ад дарогі ўзвышаецца гліняны бераг.
8. ”Чакай, не будзь задавакай!”— сказаў Міхась і пайшоў следам за Андрэйкай.

**<u>Заданне 5</u>**. У прапанаваных сказах, якія выпісаны з твораў сучасных аўтараў, выявіце ненарматыўныя напісанні або ўжыванні слоў. Адказ афарміце ў выглядзе табліцы. *Максімальная колькасць балаў* — **3** (*за любую дапушчаную памылку здымаецца* **0,5** *бала* ).

| № сказа | Ненарматыўнае напісанне (ужыванне) слова | Тып памылкі | Нарматыўнае напісанне (ужыванне) слова |
|---|---|---|---|
| 1 | | | |
| 2 | | | |
| 3 | | | |
| 4 | | | |
| 5 | | | |
| 6 | | | |

1. Выкладчыца аказалася асобай дзейснай, актыўнай і любіла хадзіць па тэатрах. 2. Я рыхтавалася да заліку, як ніколі не рыхтавалася да самага страшнага экзамена. 3. З аўдыторыі выйшла дзяўчына з яблыкам, і Уля адчула, што таксама хоча есці, толькі, як назло, нічога з сабой не ўзяла, а ў буфет ужо не паспее. 4. Эксперты палічылі, што хлопец на крутым павароце не ўтрымаў матацыкл і выляцеў у кювет, дзе, як на тое, ляжала куча сабранага з палёў камення. 5. Нядрэнная кармавая база, вялікія плошчы асушаных тарфянішчаў былі багаццем калгаса і яго рэальным рэзервам. 6. — Забудзем, Ваня! Калі б ты быў маім хлопцам, маім каханым,— Улляна з болем зірнула Вані ў вочы,— я разарвала б цябе на кавалкі ад злосці!

**<u>Заданне 6</u>.** Заўважце сказы з памылковым ужываннем слоў або іх граматычных формаў. Выправіўце заўважаныя памылкі. *Максімум балаў* — **5.**

1. Становіцца Прыпяці цесна ў калысцы сваіх берагоў.
2. З такім амаль камяністым выразам твару мы бачылі бацьку ці не ўпершыню.
3. Мая сястра з дзяцінства не церпіць ніякага фальшу ў чалавечых адносінах.
4. Гэта ячная крупа такая свежая, разварыстая.
5. Падзякаваўшы ўсіх сваіх дружбакоў лясных, вавёрка адправілася ў родную хатку.
6. Што даражэйшае паэту за волю роднае зямлі?!
7. Чытаючы апавяданне, перада мною выразна паўстаў апісаны ў ім даўні перыяд Беларусі.
8. Камісія пачала ўважліва вывучаць у магазіне прэйскурант цэн.

**<u>Заданне 7</u>.** Перакладзіце на беларускую мову.

1. Ехать по полям, по лесам, по горам.

2. Думать о нём, говорить о друге, рассказывать о борьбе.

7. Похожий на отца.

8. Навещал два раза в неделю.

9. Послать письмо по адресу.

10. Уехать на мельницу.

11. Отправиться в лес за земляникой.

**Заданне 8.** Выпраўце дапушчаныя ў сказах памылкі і моўныя хібы. Калі трэба, сказы адрэдагуйце.

1. Нейкая неакрэсленая цень ці то болі, ці то радасці прабегла па твару хлопчыка.
2. Перад намі ляжала вадзяная прастора.
3. Прамоўца паклаў на стол два экземпляра свежай газеты.
4. Рыхтуючыся да навагодняга свята, у студэнтаў быў добры настрой.

5. Хата настаўніка была ў трох кроках ад школы.
6. У маім жыцці няма нічога даражэй кнігі.
7. Сына паслалі да суседзяў за бацькам.
8. Кожнаму хацелася паціснуць руку высокага госця.
9. Міхась смялей за ўсіх у двары.
10. Сябры доўга размаўлялі па тэлефону.
11. Тры летніх дні яны правялі ў вёсцы.
12. Прабачце мяне за спазненне.
13. Сястра доўга хварэла грыпам.
14. Ліпа вырасла вышэй таго дома.
15. Залілі стол чырвонымі чарніламі.
16. Наш настаўнік арганізаваў і кіруе гуртком роднай мовы.
17. Тузік гуляў з мячом, але гаспадар крыкнуў — і ён супакоіўся.

**Заданне 9.** Перакладзіце сказы на беларускую мову.

1. Обе спортсменки пришли к финишу одновременно. 2. У обоих студентов были одинаковые оценки. 3. У меня на окне розовеют два великолепных цветка. 4. Любовь, думал я, сильнее смерти. 5. Краше её не было в селе. 6. Я слушаю еле долетающие издали звуки любимой песни.

**Заданне 10.** Як сцвярджаюць даследчыкі, выклічнікі — колькасна невялікі клас слоў, але кожная адзінка гэтага класа здольная перадаваць самыя

разнастайныя эмоцыі чалавека. Запішыце ў табліцу, якія эмоцыі перададзены ў кантэкстах з дапамогай выдзеленых выклічнікаў. *Максімальная колькасць балаў* — **4** (**0,5** *бала за правільна ўказаную семантыку выклічніка*).

| | |
|---|---|
| **1.** ***Божачкі!*** Такую школу пабудавалі! Калі толькі паспелі? | |
| **2.** Закончыліся заняткі. Канікулы. ***Божа!*** Ніякіх падручнікаў! Ніякіх урокаў! | |
| **3.** ***Божа мой!*** Лес! Нарэшце прыйшлі! | |
| **4.** ***Бо-ожа,*** што мне рабіць? Хочацца, каб усе людзі паважалі адзін аднаго, дапамагалі бліжняму, не сварыліся, былі шчырымі і добрымі… | |
| 5. Божа! ***Яны хацелі спаліць усю вёску!*** | |
| **6.** ***Божа мой!*** Як яна магла пакінуць хворую маці адну на цэлы дзень? | |
| **7.** Моцна ўдарылася? ***Божа мой!*** Ну пацярпі крыху, хутка перастане. | |
| **8.** ***Божа мой,*** за цэлы тыдзень вывучыў адзін верш. Якое дасягненне! | |

**Заданне 11.** Утварыце словазлучэнні з наступнымі словамі і вызначце, да якіх часцін мовы яны адносяцца.

Настрой, тры, люты, ведаў, святы, хвалю, парай, палкі, забег, гонкі, біла, які, абапал, адзін.

**Заданне 12.** Адзначце групы словазлучэнняў без граматычных памылак. Выпраўце памылкі ў няправільна пабудаваных словазлучэннях:

1) *пасмейваліся над сябрам, смяяліся пра сябе, высмейвалі заганы жыцця;*

2) *крыху маладзейшая за сястру, выпраўляць у свет па шчасце, вельмі ўдзячны вам;*

3) *загадчык аддзела, пісаць на адрас, дом на пяць паверхаў;*

4) *бачыць свімі вачыма, некалькі разоў на тыдзень, метрах у дваццаці ад лесу;*

5) *не бачыліся больш за дзесяць гадоў, паслаў па малако, чуў на свае вушы;*

6) *тры вялікіх возеры, чатыры новых алоўкі, два вялізных дома;*

7) *ісці па лесе, бегчы па мосце, крочыць па сцяжынцы;*

8) *паслаў па адрасу, блукаў па дарогам, выбраўся па грыбы;*

9) *спыніўся за тры крокі, чытаў сам сабе, вілы на тры рагі;*

10) *ісці па зялёнаму лугу, не бачыліся цэлыя два гады, у два цэлых і тры дзесятых разы;*

11) *дом у пяць паверхаў, вышэйшы за бацьку, хадзіў па лугам;*

12) *смяяцца пра сябе, дзякаваць паэту, захварэць на ангіну;*

13) *загадчык кафедры, пісаць на адрас, спатыкацца аб пень;*

14) *бачыць на свае вочы, некалькі разоў на тыдзень, метраў за дваццаць ад лесу;*

15) *не бачыліся больш дзесяці гадоў, паслаў па малако, чуў на свае вушы.*

**Заданне 13.** Графічна абазначце, якімі членамі сказа з'яўляюцца падкрэсленыя словы і спалучэнні слоў.

1. Я ўжо рабіў невялікія намаганні збіраць казкі. *(Я. Чачот)*
2. Услед ёй чмялём прагудзеў нешта мужчына. *(А. Васілевіч)*
3. Нанач радыё не выключалі, бо на досвітку яно будзіла, усіх ставіла на ногі. *(В. Казько)*
4. Чалавек высокай адукацыі і дасведчанасці ўмее любіць не толькі сваё, уласнае, роднае. *(Ф. Янкоўскі)*
5. Слова "эміграцыя" лацінскага паходжання і ў сваёй першароднасці азначае ўсяго толькі "высяляцца", "перасяляцца". *(Б. Сачанка)*
6. Ды ўсё гэта для буслянят — тое "вельмі далёка", што яшчэ будзе ў вялікім, хвалюючым іхнім "пасля". *(Я. Брыль)*
7. Літара, а затым слова, прачытанае па складах, заўсёды былі на пачатку сцежкі ў свет "мудрасці кніжнай". *(А. Бельскі)*
8. "Ненавідзець — гэта ўсё ж любіць," — хочацца сказаць табе на ростань. *(Я. Сіпакоў)*

**Заданне 14.** Запісаць, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца словы ў прыведзеным тэксце. *3 балы.*

Хто можа песню спець,— няхай спяе натхнёна!

Хто мае крылляў моц,— хай прагне ў даль яснот!

О мой народ! Шырокі шлях праменны

Перад табой,— заве цябе ў паход! *К. Кірэенка*

*(Непісьменнасць складальнікаў задання: няўжо ў бел. літаратуры няма вершаў ці ўрыўкаў з прозы* <u>*без*</u> *памылак? Абавязкова дзецям ілюстраваць як узорныя тэксты з памылкамі?)*

<u>**Заданне 15.**</u> Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя знакі прыпынку. Выканайце заданні да тэксту. *Максімальная колькасць балаў — **4** ( **0,5** бала здымаецца за кожную памылку)***.**

Той асенні дзень быў цёплы і пахмурны. Лісце ляжала пад нагамі тоўстым стракатым дываном і нам з сябрам добра было хадзіць па ім, варушыць лістоўныя сумёты нагамі і адчуваць сябе бязбожна шчаслівымі нягледзячы на лёгкі сум. Таму што мы былі ў Залессі былым маёнтку славутага Міхала Кляофаса Агінскага,”паўночных Афінах”, як называлі гэты кут сучаснікі.

Залессе адна з самых паэтычных мясцін нашай радзімы, а восень надавала ўсяму, што мы бачылі вакол, лёгкую паціну чысціні, празрыстасці і журбы.

Магутныя прысады клёнаў і ліп ішлі да Віллі, туліўся ў зарасніках старажытны цёплы дом са свечкамі калон, ртутна свяціліся ставы, ручай імчаў праз грэблю. І ва ўсім, што вакол, была музычнасць, ціхая песня у плёску вады, у шолаху лісця, у парывах ветру, які гайдаў палын на мяжы.

Ёсць мелодыі, якія чуеш так часта, што пачынаеш грэбаваць імі. Ад частага паўтарэння можа абрыднуць думаецца мне нават ”Легенда” Вяняўскага. Але колькі б ты ні слухаў паланезы Агінскага, а асабліва вялікі паланез ля-мінор (”Развітанне з радзімай”) — ён застанецца блізкі і дарагі твайму сэрцу, будзе закранаць у ім самыя глыбінныя, самыя свае струны. І тады добра робіцца ад думкі, што вось нарадзіўся недзе ля Варшавы дзвесце гадоў таму чалавек, жыў, ваяваў, быў дыпламатам і паўстанцам, пісаў між іншым музыку і дзякуючы гэтай музыцы стаў табе і ўсім іншым блізкі і родны. Яшчэ адзін прыклад магутнай повязі, што яднае ўсіх <u>чыста</u> на свеце добрых людзей. *Караткевіч У. Песня з паўночных Афін*

| **Заданні:** | **Адказы** |
|---|---|
| 1. Запішыце дзеясловы з тэксту у форме 2-й ас. мн. л. цяпер. часу абвесн. ладу: *ішлі, свяціліся, чуеш, застанецца, закранаць, нарадзіўся.* (**0,5** бала за кожнае слова) | |
| 2. Запішыце значэнне слова ***паціна.*** (**0,5** бала) | |

| | |
|---|---|
| 3. Якой часцінай мовы з'яўляецца падкрэсленае слова? (**0,5** бала) | |
| 4. Які стыль тэксту? (**0,5** б.) | |
| 5. Да якога жанру адносіцца гэты ўрывак? (**0,5** б.) | |

# Тэма 11. СЛОВАЗЛУЧЭННЕ ЯК СІНТАКСІЧНАЯ АДЗІНКА

**Пытанні.** Віды сувязі слоў у словазлучэннях: дапасаванне (поўнае і няпоўнае), кіраванне (моцнае і слабае), прымыканне (уласнае і іменнае). Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове ў параўнанні з рускай.

**Заданне 1.** Прапанаваныя спалучэнні слоў падзяліце на словазлучэнні і несловазлучэнні. Абгрунтуйце сваё меркаванне. Прачытайце прыклады ў адпаведнасці з нормамі беларускага літаратурнага вымаўлення.

*Ісці па кладцы, луг і поле, рыжскі цягнік, абапал сцежкі, невялікае балотца, у рэчцы, раскінуцца вакол, не быў, самы адчайны, даспелены яблык, семдзесят восем, аб'езджаны конь, дождж ідзе, сто адзінаццаць, выпадак зручны, летаваць у вёсцы, сакавік і красавік, другі квартал, расце аер, збіраць садавіну, нібы прывід, удалы прыклад, з мармуру, пеставаць дзіця.*

**Заданне 2.** Падкрэсліце сэнсава непадзельныя спалучэнні слоў:

*Крайняя Поўнач, суровая Поўнач, Заходне-Сібірская нізіна, заходнесібірская тайга, сібірскія рэкі, Далёкі Усход, далёкі край, Заходняя Сібір, еўрапейскія краіны, заходні напрамак, Белавежская пушча, дубы Белавежы, белавежскія зубры, берталетава соль, лыжка солі.*

**Заданне 3.** Якім відам падпарадкавальнай сувязі звязаны кампаненты словазлучэнняў:

*іх песня і голас, яго далікатнасць, ручнік з птушкамі і кветкамі, узбярэжжа Балтыйскага мора, закон псіхалагічнага маятніка, спыніліся на ўзлессі, сустрэцца ў верасні, чалавек вялікага таленту, хусцінка ў блакітныя кветачкі:*

слабае кіраванне
моцнае кіраванне
уласнае прымыканне
іменнае прымыканне

**Заданне 4.** Адзначце словазлучэнні, у характарыстыцы якіх дапушчана памылка:

1) *пяты дом* – лічэбнікавае, поўнае дапасаванне
2) *дрэнны настрой* – назоўнікавае, поўнае дапасаванне
3) *вельмі прывабны* – прыметнікавае, уласнае прымыканне
4) *экзамен зімой* – назоўнікавае, слабае кіраванне

**Заданне 5.** Якая характарыстыка словазлучэння ***вогненна-расплаўленае неба*** правільная:

1) простае, назоўнікавае, поўнае дапасаванне
2) складанае, назоўнікавае, поўнае дапасаванне
3) простае, назоўнікавае, няпоўнае дапасаванне
4) складанае, назоўнікавае, няпоўнае дапасаванне

**Заданне 6.** Параўнайце сказы з арыгінальных і перакладных тэкстаў. Выпішыце з іх словазлучэнні, розныя паводле будовы ў беларускай і рускай мовах. Растлумачце, у чым заключаецца розніца.

1. Потым падышоў да адчыненага акна і доўга любаваўся на каштан. – Потом подошёл к открытому окну и долго любовался каштаном.
2. Ён дакрануўся вуснамі да яе шчакі.– Он прикоснулся губами к её щеке.
3. Прысаромлены Зазыба патрываў, пакуль пачне хіліцца на лес сон. – Пристыженный Зазыба выждал, пока начнёт клониться к лесу солнце.
4. Паўз вокны ішоў стараваты чалавек. – Мимо окон прошёл пожилой человек.
5. Ён перадаў гэты тэкст а пятай гадзіне дня. – Он передал этот текст в пять часов дня.
6. Па азнаямленні Лабановіч падзяліў іх на тры групы. – После ознакомления с ними Лобанович разделил их на три группы.
7. Мужчыны нашы днямі ўжо бачылі гэты спектакль. – Мужчины наши на днях уже видели этот спектакль.

# Тэма 12. ДВУХСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ. АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ. НЯПОЎНЫЯ СКАЗЫ

**Пытанні.** Дзейнік, яго граматычнае выражэнне. Тыпы выказніка ў двухсастаўным сказе. Сінтаксічная сувязь паміж кампанентамі граматычнай асновы ў двухсастаўным сказе. Даданыя члены сказа.

Спосабы граматычнага выражэння галоўных членаў у аднасастаўных дзеяслоўных і іменных сказах. Размежаванне пэўна-асабовых, абагульнена-асабовых і няпэўна-асабовых сказаў з фармальна тоеснымі формамі галоўных членаў. Размежаванне намінатыўных сказаў і знешне падобных да іх канструкцый.

Няпоўныя сказы. Кантэкстуальныя і сітуацыйныя няпоўныя сказы. Эліпсычныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе.

**Заданне 1.** У беларускай мове маецца шмат прыкладаў сінтаксічна неадназначных фраз, высвятленне актуальнага значэння якіх патрабуе адрознення тонкіх, часам цяжкаўлоўных катэгорый, што знаходзяцца на мяжы семантыкі граматычнай і лексічнай (рэферэнтнай). Напрыклад, у сказе ***Яна спявае*** дзеяслоў, захоўваючы лексічнае значэнне, можа характарызавацца прыкметамі *"пастаяннае дзеянне — часовае дзеянне"*. У выніку сказ можа мець два аманімічныя значэнні: 1) *'яна спявачка'* і 2) *'яна ў гэты час штосьці спявае'*. Запішыце, якія аманімічныя значэнні маюць наступныя сказы. *Максімальная колькасць балаў* — **5 (0,5** *бала за адно ўказанае значэнне сказа*).

| | |
|---|---|
| Пятрова лечыць маці Веранікі. | 1)<br>2) |
| Пісьменнік зацікавіў яго лёсам героя аповесці. | 1)<br>2) |
| Хлопчыкі з'елі цукеркі. | 1)<br>2) |
| Вучні чулі пра выступленне "Песняроў". | 1)<br>2) |
| Усіх усхвалявала спыненне цягніка. | 1)<br>2) |
| Я бачу вясёлых дзяцей. | 1)<br>2) |
| Праведзена даследаванне вялікай глыбіні. | 1)<br>2) |
| Шкло ў кабінеце было разбіта галінкай. | 1)<br>2) |
| Мае бацькі жывуць на адну зарплату. | 1)<br>2) |
| Сустракацца вечарам дзяўчынка адмовілася. | 1)<br>2) |

**Заданне 2.** Ахарактарызуйце сказы па мэце выказвання, інтанацыі і складу.

1. *Мусіць, гэта страшна – заблудзіцца на незнаёмай вуліцы чужой душы?..*

2. *Пакрыўдзіў, кажуць, чалавека лёс. А дзе той лёс? Які ён быў і будзе? Заўжды людзей да гора і да слёз даводзяць абыякавыя людзі.*

3. *Ніколі не збочваць з дарогі – зайздросная доля. Ды хай не міне цябе доля дарогу губляць.*

*4. Зямля! Дай моцы сыну, няхай ускрэсне ў ім і з Полацка Скарына, і з Крошына Багрым.*

*5. Хай светла збудзецца, што светла сніцца.*

*6. Травінка і краска, спеў-гоман лясны… Няўжо гэта вы мне любоў да радзімы навечна далі?*

*7. О, як мне хочацца дадому!*

**Заданне 3.** Укажыце сінтаксічную функцыю падкрэсленых слоў. Растлумачце, на падставе чаго вы гэта зрабілі.

| Сказ | Член сказа | Абгрунтаванне |
|---|---|---|
| **1.** ***Глядзець*** *гэты фільм сумна.* | | |
| **2.** *Надвор'е* ***сонечнае, яснае.*** | | |
| **3.** *Добразычлівы* ***народ*** *дзеці.* | | |
| **4.** ***Добра*** *стаміцца ад цяжкіх дарог, схіліцца ў знямозе пад елку на мох.* | | |

**Заданне 4.** Вызначце, якія магчымыя адказы могуць быць на наступныя пытанні. Прывядзіце прыклады.

1. Які від выказніка можа быць у сказе, у якім ёсць указанне на пачатак дзеяння?

2. Якім паводле саставу можа быць сказ, калі ў ім ёсць указанне на пэўную асобу?

**Заданне 5.** У кожнай групе сказаў назавіце "чацвёрты лішні". Свой адказ абгрунтуйце.

I. *1. Ляснік ішоў асцярожна, прыслухоўваўся да кожнага гуку. 2. Пасыпаліся буйныя кроплі дажджу. 3. Дні стаялі ціхія, сонечныя, поўныя задуменнага харастав. 4. Над супакоенымі хвалямі зноў крычаць чайкі.*

II. *1. Пасля палудня з поўначы пацягнула халадком. 2. Раніцою наваколле нельга было пазнаць. 3. Кепска жыць без працы, без клопату. 4. Прыемна ў вочы любімыя глядзець.*

III. *1. Сонца. 2. Блакітнае неба. 3. Жытнёвае поле. 4. Трава ўся ў расе.*

IУ. *1. Зіма сёлета марозная. 2. Сонца барвовае, агністае, сляпучае. 3. Рэкі і азёры скаваны ледзяным панцырам. 4. Дрэвы па плечы патанулі ў снезе.*

**Заданне 6.** У кожнай групе сказаў назавіце "чацвёрты лішні" нумар. Свой адказ абгрунтуйце.

**I.** *1. Салёныя хвалі. Місхораўскі шум. Прыціхлае Чорнае мора. 2. Чыім прызнаннем – на траве раса? Чыім сакрэтам – пошум хвой высокіх? 3. Вечар. І мора. І шторм. Далоні чакання. І неба абдымкі. 4. Восень. Слота. Туман.*

**II.** *1. На сінім небе палосамі сівыя хмары. 2. Мая Беларусь у рамонку і верасе. 3. І ў мудрасці, і ў зайздрасці дарослыя дзеці. 4. Сцяжуткі, чысценькі нябёсы, бы тыя вочкі маладыя.*

**III.** *1. Нарэшце сонца. А на дахах сівы мароз. 2. У восені надвор'яў восем на кожны дзень. 3. Як на Пакровы дождж, то на Юр'я лісце. 4. Мне саладзейшыя самыя вятры з Дзвіны баравыя.*

**Заданне 7.** Вучань зрабіў поўны сінтаксічны разбор сказа ***Ты пачынаешся тады, калі ты застаешся адзін, калі ніхто і нішто не дапамагае табе быць добрым або дрэнным, калі ты робіш выбар сам*** (Я. Брыль).

Кожную частку ён ахарактарызаваў як абагульнена-асабовы сказ. Як бы вы паставіліся да такога аналізу?

**Заданне 8.**

1. Ці можа быць у простым неразвітым сказе больш чым два словы? Адказ падмацуйце прыкладамі.

2. Запішыце сказы, якія складаюцца з двух знамянальных слоў. Вызначце структурна-семантычны тып кожнага сказа.

3. Выпішыце неразвітыя сказы.

*Пачнём чытаць. Жыта як сцяна. Усе ў полі. Дачакаліся жніва. Пачнём з усходам сонца. Буду камбайнёрам. Ціхая раніца. Ясь не ў гуморы. Зелянеюць лугі і поле.*

**Заданне 9.** Адзначце нумары аднасастаўных сказаў (самастойных або як частак складаных)

а) пэўна-асабовых
б) няпэўна-асабовых
г) абагульнена-асабовых

1. Падсякаем бяздумна карэнні свае і асновы. 2. Адным ударам тапара дрэва не зваліш. 3. Бачыш чаек на вадзе? Ці не з усяе Нарачы сабраліся перад выраем? 4. Ад мяне чакаюць чалабітнае: душу і галаў у пояс нахіліць. 5. Давай закінем за плечы яшчэ няцяжкую ношку гадоў. 6. Усё жыццё жывеш расстаннем з матуляй. 7. Дарэмна шукаеш, мілы, мне ў падарунак песні. 8. Збіраешся на лета ў вёску ці ў горадзе застанешся? 9. Нідзе не знойдзеш столькі вялікіх, прыгожых, магутных дубоў, як на Палессі. 10. Гаспадыняю ўвойдзеш у мой дом, дарагая. 11.Усё, што ў сэрцы, забяру з сабой. 12. Будзь бласлаўлёная, нечаканая сустрэча. 13.Цяпер

саматканыя палотны робяць рэдка, але робяць. 14. У рэшата ваду не льюць, у лес дроў не вязуць. 15. У не такія ўжо даўнія часы аўтобусаў на Палессі не ведалі. 16. Тут не хваляцца шчасцем, а працуюць і проста жывуць. 17. Дзяўчыне песень не спявалі і не пілі хмель-віна. 18. За справамі бацькоў не забывайце, не крыўдзіце няўвагай. 19. Адрозніваюць тры віды веславання: на байдарках, на каноэ і акадэмічнае. 20. Даўно зацягалі, забрудзілі слова "інтэлігентнасць".

**Заданне 10.** Занясіце дзеяслоўныя формы ў адпаведныя раздзелы табліцы:

***1 ас., адз. л., абв. л.; 2 ас., адз. л., абв. л.; 1 ас., мн. л., абв. л; 2 ас., мн. л., абв. л.; 1 ас., мн. л., заг. л.; 2 ас., мн. л., заг. л.; 2 ас., адз. л., заг. л.; 3 ас., мн. л., заг. л.; 3 ас., адз. л., абв. л.; 3 ас., адз. л., заг. л.; форма прошлага ч. адз. л.; форма прошлага часу мн. л.***

***Спосабы граматычнага выражэння галоўнага члена ў аднасастаўных дзеяслоўных асабовых сказах***

| Пэўна-асабовыя сказы | Няпэўна-асабовыя сказы | Абагульнена-асабовыя сказы | Дзеяслоўныя формы не могуць быць галоўнымі членамі асабовых сказаў |
|---|---|---|---|
| | | | |

**Заданне 11.** Вызначце характар структурных і семантычных адрозненняў для наступных пар сказаў.

1. *Шмат каму ўспомніцца глыбіні марской таемны холад. -- Слоў не хочацца кідаць на ўзвей-вецер.*

2. *Разгалістае зялёнае дрэва ўяўляецца мачтай. -- Пастуху салодка спіцца на траве-пырыне.*

3. *Хіба дзеду сівому і ўспомніцца глыбіні рачной дзіўны свет. -- Ой, як ціха пяецца пра лясок невысок, пра Марусіна сэрца і яе паясок.*

**Заданне 12.** Прачытайце тэксты. Вызначце, якія знакі прыпынку ў іх з'яўляюцца нарматыўнымі, а якія – аўтарскімі. Чаму, на Вашу думку, паэты адступілі ў прыведзеных тэкстах ад нарматыўнай пунктуацыі?

| | |
|---|---|
| Ты – боль, паэзія. Ты – бой.<br>Ты – праўды непрыступнай вежа.<br>Я – праведнік і грэшнік твой,<br>Пусці – мяне ў свае бязмежжа.<br>*(Л. Галубовіч)* | Мы табой ганарымся – і плачам,<br>Мы нясём цябе ў сэрцы праз дым.<br>Нізка голаў схіляю, юнача,<br>Перад вечным глаголам тваім!<br>*(У. Караткевіч)* |

**Заданне 13.** Адзначце, які(я) з прыведзеных прыкладаў адпавядаюць наступнаму азначэнню: *"Сказ, у якім выражаецца значэнне павіннасці, неабходнасці, немагчымасці, непазбежнасці, пажаданасці, мэтазгоднасці дзеяння ці меркаванне адносна яго ажыццяўлення"*.

Вызначце тып гэтых сказаў.

| С к а з | Т ы п с к а з а |
|---|---|
| 1. Паслухаць бы драздоў свістанне ў час ружовага світання. | |
| 2. Пахам мядовым дыхнула ад дрэў. | |
| 3. На граніцы паласу барануюць, нібы ў полі. | |
| 4. Нам пройдзеных дарог не перамераць І нанава ніколі не прайсці. | |
| 5. Там ліры гук і посвіст косаў Злучу ў адзін нячутны хор. | |

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: _______________

# Тэма 13. СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ

**Пытанні.** Складаназлучаныя сказы, сінтаксічныя адносіны і знакі прыпынку ў іх.

Злучнікі і злучальныя словы ў складаназалежных сказах. Сінтаксічныя адносіны і віды даданых частак у складаназалежных сказах. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах. Граматычнае канструяванне (складанне схем сказаў і складанне сказаў паводле прапанаваных схем).

Бяззлучнікавыя складаныя сказы, сінтаксічныя адносіны і знакі прыпынку ў іх.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, іх віды і знакі прыпынку ў іх. Граматычнае канструяванне такіх сказаў.

**Заданне 1.** У сказах са злучнікам ***і*** вызначце сінтаксічныя адносіны: а) спалучальныя — адначасовасці або паслядоўнасці, б) прычынна- або ўмоўна-выніковыя. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

1. І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты і ў спёку жыгане цябе зіма. 2. Тут як у казцы лісіца пеўня зносіла і вечар глух ад камароў. 3. Учора шчасце толькі глянула нясмела і развеяліся хмары змрочных дум. 4. Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор і гэты твор — мова. 5. Поле веяла воляй і дарогі ўсе звалі ісці. 6. Самотна зорка над зямлёй згарае і ў гурбах ліпа з холаду дрыжыць. 7. Дзён падрэзана ніць і зямлячкі хусцінаю жураўлёва крыло паплыло ад зямлі. 8. Схаваецца сонейка за рваныя асеннія хмары і ўмомант ва ўсёй прыродзе адбудзецца рэзкая перамена. 9. Узмах весла і сонны бераг адразу пачынае жыць. 10. Недзе справа заходзіць сонца і роўнае спакойнае святло яго ацяпляе бронзавыя ствалы робіць іх жывымі мітуслівымі. 11. Стаяў калісь тут бор стары і жыў лясун у тым бары.

**Заданне 2.** Адзначце нумары сказаў з дадзенымі дзейнікавымі часткамі.

1. Зімовыя мяцеліцы, што заносілі снегам шашу, супакоіліся.
2. Тады здавалася, што ў яловы гушчар заплыў і застаўся там назаўсёды густы восеньскі туман.
3. І настаў такі час, што пралітыя слёзы перапоўнілі неба і паліліся назад на зямлю.
4. Тое, што бацька вяртаецца з нейкімі навінамі, крыху трывожыла Макарку.
5. І раптам яму ўявілася, якім страшным, нават жудасным здаваўся б ён з касою кветкам.
6. У яго сэрцы жыве родная мелодыя як успамін аб той зямлі, што ўзгадавала яго.
7. На душы было радасна, што кожны крок набліжае яго к роднаму дому.
8. Усё, што нагадвае пра дзяцінства, чалавек зберагае ў душы і перадае дзецям сваім.
9. Здзіўляюся ўсмешцы немаўляці, што цмокае губамі і гудзе, і прыгажосці маладзенькай маці, што прытуліла сына да грудзей.
10. Успамінаюцца сустрэчы і самыя шчаслівыя часы, што і цяпер здаюцца нам вясною.
11. І будзе відаць у сусвеце, як неба святкуе Купалля пару на трыццаць другім маім леце.
12. Тое, што Ефрасіння Полацкая зрабіла для асветніцтва роднай зямлі ў сваю эпоху, яднае стагоддзі.

**Заданне 3.** Запішыце сказы, замест кропак устаўце патрэбныя злучнікі ці злучальныя словы, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Вызначце віды дадзеных частак — дзейнікавыя ці выказнікавыя (дапаўняльныя ці азначальныя паводле школьнай праграмы).

1. … цураецца радні … цураецца сяла той як птах без вышыні той як хата без цяпла.
2. Чамусьці сёння цішыня такая … сесці хочацца і патужыць.
3. … любіць і шануе красу зямлі той абавязкова бывае і шчырым яе абаронцам.
4. Усё … сёння трывожным здаецца заўтра стане малым успамінам.
5. Як добра … ва ўсе вякі жывуць на свеце дзівакі.
6. Зімой згодзіцца … ўлетку родзіцца.
7. … згублена лёс не вяртае.
8. Не збярэ жнівом ураджаю … вясну маладую праспіць.
9. … карэнне такое і насенне.
10. … народ такі й паэт. … паэт такія й людзі.

**Заданне 4.** Запішыце сказы, якія адпавядаюць прыведзеным схемам. Назавіце тыпы гэтых сказаў.

СХЕМА 1. [Здавалася], (нібы…).

СХЕМА 2. [ ... ], (дарма што ...).

СХЕМА 3. [ ... ], (ажно ...).

СХЕМА 4. [ ... усё], (што ...).

СХЕМА 5. [ ... ], (ці ...).

**Заданне 5.** Вусна ўзнавіце знакі прыпынку. Запішыце сказы, якія адпавядаюць схемам:

а) [ ] — [ выражае дадатковае паведамленне ];

б) [ ] : [ паясняе, удакладняе слова ў першай частцы];

в) [ ] : [ дапаўняе першую частку].

1. На зямлю сырую ціха ночка пала бляскам-дрыгаценнем зорка замігала.
2. Бывае так паміж клапотаў, між працы тлумных вечароў агорне часам адзінота.
3. Агнявыя валаконцы ткуцца ў шоўк чырвоны гэта хмаркі ладзяць сонцу і зямлі карону.
4. Спадала гарачыня гусцелі фарбы навакол духмяна пахла лугавой травой.
5. Як зманьвае, як спакушае пераджытае як хочацца скупануцца ў светлай і жывой вадзе былых дзён!
6. Біяграфія ў песні маёй і ў мяне адна пад дзіравай страхой гадаваліся я і яна.
7. У Лынькова было яшчэ адно, як цяпер кажуць, хобі ён любіў фатаграфаваць праз агонь.
8. Цяпер я з гонарам магу сказаць нішто так не ўзвышае, не падымае на п'едэстал духоўнай годнасці чалавека, як мастацкая літаратура.
9. Цёплым крылом махне вясна расцвітаюць яблыні зноў.
10. Іван Мележ сцвярджаў усёй сілай свайго таленту гэтыя людзі не для паказу вам жывуць, не дзеля экзатычнай забаўкі.

**Заданне 6.** Прывядзіце прыклады бяззлучнікавых складаных сказаў у адпаведнасці са схемамі. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

1) [ ] [ хуткая змена падзей ];

2) [ ] [ ] — супастаўленне з'яў, падзей;

3) [ умова ] [ вынік ];

4) [ ] [ прамое пытанне];

5) [ ] [ неадпаведнасць зместу];

6) [ ] [ паясненне].

**Заданне 7.** Зрабіце поўны сінтаксічны разбор складанага сказа.

*Перад самымі вачыма Верасоўскага ціха сам сабою як усё роўна яго нехта зачапіў пагойдваўся рамонак які формаю нібы паўтараў сонца і гэты рамонак абуджаў у ім нейкі невыразны ўспамін але ён спрасоння не хацеў дашуквацца яго.* (Я. Сіпакоў)

**Заданне 8.** Дапоўніце часткі беларускіх прыказак і прымавак, пабудаваных па схеме складаназалежнага сказа. Дайце структурную характарыстыку аднолькавым часткам.

| | | |
|---|---|---|
| 1. Дзе пасееш густа, | | |
| 2. Дзе дым, | | |
| 3. Дзе гаспадар ходзіць, | | |
| 4. Дзе дровы сякуць, | | |
| 5. Дзе не можна сілаю, | | |

**Заданне 9.** Зрабіце поўны сінтаксічны разбор сказаў. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

1. Не самае важнае дзе ён жыў і дзе пісаў свае творы. Але важна ждя нас тое што ён усё сваё жыццё шчымліва спавядаўся ў любові да роднай зямлі якая яго нарадзіла якая ўзгадавала яго сваімі песнямі і казкамі. Ён казаў што ў казках і песнях беларусаў схавана ўся прыгажосць зямлі радаваўся што беларуская мова "найбольш гарманічная і найменш перакручаная з усіх славянскіх дыялектаў" і што "няма народа чысцейшага чым нашы калтунястыя беларусы". *(Янка Сіпакоў пра Адама Міцкевіча)*

2. Славу гораду як і зямлі робяць славутыя людзі. У гэтым сэнсе Гародні пашэнціла ў ёй жыло нямала выдатных славутых людзей і сярод іх наш першы інтэлігент у літаратуры тонкі і трагічны Максім Багдановіч.

# КОМПЛЕКСНАЕ ЗАДАННЕ ДА ЗАЛІКУ

***Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.***

Малая радзіма! Што гэта такое? Адкуль і дакуль яе межы?

Вось пра гэта я і пачаў думаць, ***ступіўшы*** на зямлю сваёй малой радзімы, сваёй палескай вёскі. Па-мойму, яна — гэта абсяг нашага дзяцінства. Іншымі словамі, тое, што могуць бачыць дзіцячыя вочы і што прагне ўвабраць у сябе чыстая, шчырая душа. Гэта там, дзе душа ўпершыню здзівілася, узрадавалася і аж зайшлася ад шчасця і дзе ўпершыню ***засумавала*** або перажыла сваё першае ўзрушэнне.

Ціхая вуліца, матчын агародчык, які запрашае, цягне да сябе, каб пачаставаць самымі смачнымі вясковымі ласункамі. Потым — сад, дзе вісне з яблынь

цыбулевымі ***пляцёнкамі*** галлё з ***чырванабокімі*** яблыкамі. За садам — духмяны абшар поплава…

Малая радзіма — гэта тое, што на ўсё жыццё адорвае нас крыламі ***натхнення.*** *Паводле М. Капыловіча.*

## Заданні

1. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

2. Назавіце ў тэксце абстрактныя назоўнікі са значэннем псіхаэмацыянальнага стану, пабудуйце з імі сінанімічныя рады. Папоўніце ”слоўнічак сінонімаў” уласнымі прыкладамі (словы не павінны выходзіць за межы названай тэматычнай групы).

3. Выпішыце з тэксту 6 слоў, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае. Коратка растлумачце гэту з’яву (пазбягайце аднастайнасці ў прыкладах).

4. Прыметнікі ў тэксце размяркуйце па разрадах. Ад трох прыметнікаў утварыце ўсе магчымыя формы ступеней параўнання.

5. Зрабіце марфемны і словаўтваральны аналізы выдзеленых у тэксце слоў.